Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 ЛІПЕНЯ 2007 г. АЎТОРАК

№ 136 (26001)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:
«Беларусь выпрацавала сваю мадэль развіцця не па чужых рэцэптах»

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 23 ліпеня прыняў даверчыя граматы паслоў 11 краін: Германіі, Рэспублікі Кенія, Каралеўства Марока, Каралеўства Нідэрландаў, Султаната Аман, Сірыі, Украіны, Швейцарыі, Шры-Ланкі, Эфіопіі, Японіі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Вітаючы дыпламатаў, Прэзідэнт адзначыў: «Беларусь выпрацавала сваю мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, свой шлях будаўніцтва прававой дэмакратычнай дзяржавы не па чужых рэцэптах, а абапіраючыся на гістарычныя традыцыі, інтарэсы і памкненні народа. У многім дзякуючы гэтаму ў нас высокія тэмпы эканамічнага развіцця і сацыяльна-палітычная стабільнасць грамадства». Паводле слоў Прэзідэнта, галоўны прынцып знешняй палітыкі Беларусі — шматвектарнасць і развіццё ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Прымаючы даверчыя граматы кіраўніка ўкраінскай дыпламатычнай місіі Ігара Ліхавога, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь традыцыйна надае вялікае значэнне супрацоўніцтву з Украінай. «За гады незалежнасці мы здолелі ўмацаваць і пашырыць усталяваныя на працягу стагоддзяў эканамічныя і культурныя адносіны двух роднасных славянскіх народаў», — падкрэсліў беларускі лідар. За апошнія 4 гады тавараабарот паміж Беларуссю і Украінай вырас больш як у 4 разы і склаў у 2006 годзе амаль $2,5 млрд.

Паводле слоў Прэзідэнта, Германія займае асаблівае месца сярод важнейшых знешнепалітычных і знешнеэканамічных інтарэсаў Беларусі. «Перакананы, што яе палітычны ўплыў і аўтарытэт могуць быць асабліва запатрабаваны сёння, калі на парадку дня стаіць пытанне пераадолення ўзаемнага недаверу і нармалізацыі палітычнага дыялога паміж Беларуссю і Еўрасаюзам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб зацікаўленасці Беларусі ў далейшым пашырэнні супрацоўніцтва з Нідэрландамі. «Гэта краіна — адзін з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў Еўропы — вядома ў свеце сваімі транспартна-лагістычнымі структурамі, тэхналогіямі аптовых біржавых таргоў, таму яе вопыт у гэтай сферы мае для нас несумненны інтарэс», — адзначыў Прэзідэнт.

Сувязі Беларусі і Швейцарыі сёння паспяхова развіваюцца ў гуманітарнай сферы, асабліва па чарнобыльскай праблематыцы. «Але гэтага зусім недастаткова, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Ёсць усе перадумовы для іх пашырэння і ў іншых галінах, якія маюць узаемную цікавасць. У прыватнасці, мы віталі б больш актыўны ўдзел швейцарскіх банкаў у банкаўскім сектары Беларусі».

Прэзідэнт адзначыў пазітыўную дынаміку адносінаў паміж Беларуссю і Сірыяй: «Аб дасягнутым узроўні двухбаковых кантактаў у розных галінах сведчыць рашэнне сірыйскага кіраўніцтва аб адкрыцці дыпламатычнай місіі Сірыі ў Мінску».

Прымаючы даверчыя граматы ў кіраўніка дыпламатычнай місіі Султаната Аман, Аляксандр Лукашэнка выказаў задавальненне пазітыўнымі зрухамі ў беларуска-аманскім узаемадзеянні.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў намер Беларусі актывізаваць супрацоўніцтва з такімі краінамі, як Марока, Эфіопія, Кенія, Шры-Ланка.

Звяртаючыся да пасла Японіі, Прэзідэнт заявіў: Беларусь разлічвае на цесную кааперацыю з японскімі вытворцамі ў рэалізацыі праектаў па ўкараненню высокатэхналагічных навацый у сферы энерга- і рэсурсазберажэння. У сваю чаргу японскі пасол перадаў Аляксандру Лукашэнку цёплыя пажаданні ад імператара і выказаў надзею на далейшае развіццё дружалюбных адносінаў.

Прэзідэнт пажадаў замежным дыпламатам поспехаў у выкананні іх місіі і пацвердзіў, што беларускае кіраўніцтва акажа ўсё неабходнае садзейнічанне.

На ўбраных 747 тыс. га намалочана 2,2 млн тон збожжа

Паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі.

У сярэднім за дзень убіраецца амаль 5 працэнтаў збожжавых. Больш за ўсё ўбрана збожжавых у Гомельскай вобласці — 40 працэнтаў, Гродзенскай — 37 працэнтаў, у Брэсцкай — 38 працэнтаў, у Мінскай — 32 працэнты. Сярэдняя ўраджайнасць па рэспубліцы складае 29,6 ц/га. Гэта вышэй на 3 ц, чым у мінулым годзе. Самая высокая ўраджайнасць у Гродзенскай вобласці — 36,3 ц/га.

Налічаная сярэдняя зарплата работнікаў ў чэрвені склала Br710 тыс. 232

Паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу рэспублікі. Гэты паказчык у маі гэтага года складаў Br686 тыс. 852.

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у чэрвені гэтага года склала Br728 тыс. 15 (у маі яна была Br705 тыс. 238).

ЛЯ МАКСІМАВАЙ КРЫНІЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Свята песні і паэзіі «Ракуцёўскае лета-2007» адрозніваецца ад многіх паэтычных святаў краіны тым, што глядзельная зала знаходзіцца на духмяным кветкавым пагорку, у падножжа якога бруіцца славутая крынічка Максіма Багдановіча. Гэтым разам, акрамя выступленняў паэтаў, бардаў і фальклорных калектываў, у музеі «Фальварак Ракуцёўшчына» адбылося адкрыццё «Дома гаспадара» — будынка, які цалкам захаваўся ад часоў Максіма Багдановіча. Цяпер у гэтай пабудове — экспазіцыя хатняга інтэр'ера фальваркоўца пачатку XX стагоддзя. Гасцей было нямала, нават з Пецярбурга і Масквы.

Была сярод іх і вучаніца чацвёртага класа з суседняй з Ракуцёўшчынай вёскі Чысць **Аліна МУКОНІНА** *(на здымку)*. Традыцыйнае свята ў гонар слаўнага паэта стала сапраўдным упрыгожаннем Маладзечанскай зямлі.

Беларусь плануе да канца 2007 года выйсці на прамысловую здабычу нафты ў Венесуэле

Аб гэтым у эфіры Першага нацыянальнага канала паведаміў Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Віктар Шэйман, падводзячы вынікі афіцыйнага візіту беларускай урадавай дэлегацыі ў Венесуэлу.

У ходзе візіту беларускай дэлегацыі ў Венесуэлу падпісана 18 дакументаў аб двухбаковым супрацоўніцтве, заключана кантрактаў у агульнай колькасці на суму $250 млн.

Да кастрычніка гэтага года ў Венесуэле будуць створаны тры сумесныя прадпрыемствы: мінскіх трактарнага і аўтамабільнага заводаў, а таксама вытворчага аб'яднання БелАЗ з венесуэльскай карпарацыяй па вытворчасці аўтатэхнікі.

Плануецца таксама падпісаць кантракт на праектаванне і будаўніцтва газавай сеткі ў горадзе Барынас, у якім пражываюць больш як 200 тыс. чалавек.

Мінскі завод колавых цягачоў паставіць у Венесуэлу тэхнікі на $14,5 млн, сума кантракта на пастаўку будаўнічай дарожнай тэхнікі перасягне $49 млн. Акрамя таго, будзе створана сумеснае прадпрыемства па вытворчасці бытавой тэхнікі. Арыенціровачны кошт гэтага праекта — $140 млн.

Беларусь і Венесуэла заключаць кантракты ў сферы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва на суму больш за $1 млрд.

Дзяржсакратар Савета Бяспекі таксама адзначыў, што ў час візіту былі абмеркаваны пытанні палітычнага супрацоўніцтва, міжнароднай палітыкі, развіцця дагаворна-прававой базы. Адбыліся кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў Беларусі і Венесуэлы па пытаннях развіцця двухбаковых адносінаў. «Асаблівая ўвага была ўдзелена падрыхтоўцы да падпісання ў ходзе маючага адбыцца візіту Прэзідэнта Беларусі ў Венесуэлу шэрагу міжурадавых і міждзяржаўных пагадненняў», — сказаў Віктар Шэйман.

БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЧАКАЕЦЦА НЯЎСТОЙЛІВАЕ НАДВОР'Е

Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.

У бліжэйшыя суткі надвор'е ў краіне будзе фарміраваць у асноўным поле павышанага ціску, у другой палове дня толькі на захадзе рэспублікі — атмасферны фронт. Таму ў Брэсцкай, Гродзенскай, а таксама на захадзе Мінскай і Віцебскай абласцей зноў пачнуцца дажджы, але будзе яшчэ цёпла. Днём паветра прагрэецца да 22—28 градусаў цяпла, на поўдні краіны — да 31 градуса. Тэмпература вады ў вадаёмах застанецца прыкладна такая ж, як і ў панядзелак. У рэках — ад 20 да 25 градусаў цяпла, у возеры Нарач — 19 градусаў, у Вілейскім вадасховішчы — да 20, у Мінскім моры — да 22 градусаў цяпла.

У сераду і чацвер надвор'е пагоршыцца, паколькі яно будзе фарміравацца пад уплывам атмасфернага віхру, цэнтр якога перамесціцца з поўдня Балтыйскага мора праз Латвію на Ленінградскую вобласць. Такое блізкае суседства глыбокага цыклону прынясе ў многія раёны Беларусі дажджлівае, ветранае, халаднаватае надвор'е. Дзённая тэмпература дасягне 16—23 градусаў цяпла.

Бліжэй да выхадных пачне цяплець. Тэмпературны рэжым зноў увойдзе ў ліпеньскую норму. Цыклоны будуць праходзіць далёка ад нашых граніц. Слабавыяўленыя атмасферныя франты закрануць толькі паўночныя раёны рэспублікі. Сціхне вецер. Кароткія летнія дажджы магчымы толькі ў паўночнай частцы Беларусі. У пятніцу тэмпература ўначы складзе 9—15 градусаў цяпла, днём — 22—28, на поўдні краіны — да 30 градусаў. У выхадныя будзе крыху халадней. Днём чакаецца 20—26 градусаў цяпла.

ВАРЫЯНТЫ АДРАСНАЙ ПАДТРЫМКІ НАКІРАВАНЫ НА РАЗГЛЯД УРАДА

Праект Указа «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай падтрымцы насельніцтва» падрыхтаваны і накіраваны на разгляд урада.

Дарэчы, як паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Сяргеева, узгадніць гэты дакумент удалося ў выніку трох пасяджэнняў спецыяльнай рабочай групы. Як зазначыла Валянціна Сяргеева, праект указа скіраваны на асобаў, якіх закрануў нядаўні Закон «Аб упарадкаванні сацыяльных ільгот і гарантый», у прыватнасці, гаворка ідзе аб ветэранах працы, студэнтах, былых вязнях. Пры гэтым адначасова дакумент мае на мэце прадаставіць большую падтрымку маламаёмным грамадзянам краіны — дзякуючы павелічэнню «планкі даплат» пры аказанні адраснай сацыяльнай дапамогі. Варта нагадаць, што сёння гэта планка складае 60 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

Сяргей ГРЫБ.

ВАДЗІЦЕЛЬ АСУДЖАНЫ ЗА ПАДБУХТОРВАННЕ

Да пяці гадоў абмежавання волі асуджаны вадзіцель аддзела архітэктуры і горадабудаўніцтва Віцебскага гарвыканкама.

Маючы пасведчанне супрацоўніка гэтай арганізацыі, ён падбухторваў прадпрымальнікаў даваць хабар. Грошы, маўляў, будуць перададзены «адказным асобам», каб станоўча вырашалася пытанне выдзялення зямельных участкаў пад будаўніцтва гандлёвых пунктаў.

Адзін бізнэсмен у выніку «заплаціў» 400 тысяч беларускіх рублёў і 550 долараў ЗША. Вырашыў перадаць грошы і другі. Аднак супрацоўнікамі УКДБ па Віцебскай вобласці гэтая дзейнасць была спынена.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У МІНСКУ Ў ЧЭРВЕНІ СЯРЭДНІ ПАМЕР НАЗНАЧАНАЙ ПЕНСІІ СКЛАЎ BR300,5 ТЫС.,

або 122,2 працэнта да велічыні сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і пенсіянераў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні статыстыкі (МГУС).

Паводле даных МГУС, сярэдні памер пенсіі па ўзросту склаў Br313,1 тыс., па інваліднасці — Br273,4 тыс., у сувязі са стратай карміцеля — Br178,4 тыс., сацыяльнай пенсіі — Br118,5 тыс.

СМЕРЦЬ НА СКУТЭРЫ

У Брэсце малады чалавек разам са сваёй сяброўкай ноччу каталіся на скутэры. Хлопец не справіўся з кіраваннем транспартным сродкам і сутыкнуўся з пешаходам.

Вадзіцель скутэра загінуў, астатнія ўдзельнікі аварыі знаходзяцца ў шпіталі. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны. Увогуле, паводле звестак ДАІ, за мінулыя выхадныя ў Беларусі адбылося 80 ДТЗ, у выніку якіх 15 чалавек загінулі, 86 — атрымалі раненні. Усяго ж, за памянёны перыяд выяўлена 10 тысяч 856 парушэнняў Правілаў дарожнага руху, у тым ліку 617 вадзіцеляў затрымана за кіраванне транспартнымі сродкамі ў нецвярозым стане.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ЗА ПЯТЛЮ — ПЯЦЬ МІЛЬЁНАЎ

Двое жыхароў вёскі Гарадзечна Пружанскага раёна паставілі ў лесе пятлю, у якую трапіў высакародны алень. Браканьеры жывёліну забілі.

Пакаранне не прымусіла сябе доўга чакаць. За незаконнае паляванне яны павінны заплаціць два мільёны рублёў, а кампенсацыя лясной гаспадарцы за нанесеныя страты вылілася ў суму 2 945 000 рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У ДТЗ У ПОЛЬШЧЫ ПАРАНЕНЫ 23 РАСІЯНІНЫ

Паводле апошніх даных генеральнага консульства РФ у Познані, у аўтакатастрофе на тэрыторыі Польшчы ранены 23 расіяніны (у асноўным яны атрымалі пераломы, удары, сінякі), пагрозы іх жыццю няма. У цяперашні час пяцёра знаходзяцца ў стане сярэдняй цяжкасці, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы.

Расійскія турысты ехалі з Масквы да Брэста на цягніку, а ў Брэсце пераселі на аўтобус з беларускімі рэгістрацыйнымі нумарамі. Усяго ў аўтобусе знаходзіліся 47 чалавек, з іх 45 турыстаў-расіян і два вадзіцелі-беларусы.

Кар. БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі разгледзеў шэраг кадравых пытанняў

Прэзідэнт Беларусі 23 ліпеня разгледзеў шэраг кадравых пытанняў. Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Піліпца Віктара Іванавіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці.

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

Раўнейкі Сяргея Васільевіча — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці;

Шчацько Віктара Уладзіміравіча — першым намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама;

Краўцова Уладзіміра Васільевіча — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

Снапкова Мікалая Генадзьевіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

Місько Уладзіміра Трафімавіча — старшынёй Стаўбцоўскага райвыканкама;

Шайбака Віктара Леанідавіча — старшынёй Карэліцкага райвыканкама;

Жоглы Алега Міхайлавіча — кіраўніком адміністрацыі Заводскага раёна Мінска;

Казакевіча Валерыя Уладзіміравіча — старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі;

Маёрава Уладзіміра Уладзіміравіча — генеральным дырэктарам ААТ «Белтрансгаз»;

Зубкова Уладзіміра Уладзіміравіча — генеральным дырэктарам ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія»;

Пархомчыка Пятра Аляксандравіча — генеральным дырэктарам ВА «Беларускі аўтамабільны завод» — генеральным дырэктарам РУП «Беларускі аўтамабільны завод»;

Лаўніка Васіля Ігнатавіча — генеральным дырэктарам РУВП «Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік»;

Бабака Івана Паўлавіча — генеральным дырэктарам ААТ «Даламіт»;

Ермака Аляксандра Валяр'янавіча — членам Мінскага аблвыканкама;

Фармагея Леаніда Канстанцінавіча — членам Віцебскага аблвыканкама.

У сувязі з пераўтварэннем канцэрна ў дзяржаўнае аб'яднанне Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

Барадаўкі Уладзіміра Іванавіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Цэнтр»;

Ільюшчанкі Аляксандра Фёдаравіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання парашковай металургіі;

Рудзінскага Леаніда Іванавіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліву і газіфікацыі «Белпалівагаз».

Звяртаючыся да Валерыя Казакевіча, кіраўнік дзяржавы выказаў надзею на тое, што новы старшыня зробіць адпаведныя высновы з сітуацыі з папярэднім кіраўніцтвам канцэрна і «навядзе ў гэтай сферы жалезны парадак».

Перад Уладзімірам Зубковым кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ўдасканаліць сістэмы закупкі нафты і рэалізацыі нафтапрадуктаў на экспарт, каб Беларусь атрымлівала ад гэтага максімальныя выгады. «Сёння ў гэтай сферы патрэбны маладыя, разумныя, прыстойныя і надзейныя людзі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларуская нафтавая кампанія была створана ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта па аналогіі з Беларускай калійнай кампаніяй.

У няпростых умовах, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, даводзіцца сёння працаваць ААТ «Белтрансгаз». «Ні адна эканоміка гэтак хутка не можа асвоіць такое рэзкае павышэнне цэн на энергарэсурсы», — растлумачыў ён.

Беларускі аўтамабільны завод, які займае 30 працэнтаў сусветнага рынку продажаў велікагрузных аўтамабіляў, Прэзідэнт назваў адным з ключавых прадпрыемстваў эканомікі краіны. Ён пазітыўна ацаніў работу завода па прасоўванню прадукцыі на рынкі іншых краін. Разам з тым, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, кіраўніцтву БелАЗа трэба выключыць пасрэдніцкія звёны як пры закупцы камплектуючых, так і пры рэалізацыі прадукцыі на экспарт. «Нельга аддаваць да 20—25 працэнтаў кошту аўтамабіля пасрэднікам — гэта злачынства», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Такая ж задача стаіць і перад іншымі прадпрыемствамі краіны. «Мы павінны прадаваць сваю прадукцыю без пасрэднікаў і па аптымальных цэнах. Гэтым у многім вызначаецца фінансавы поспех», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ў бліжэйшы час кіраўніцтва краіны зверне самую пільную ўвагу на ўзаемаадносіны прадпрыемстваў і пасрэднікаў — кантралюючыя органы ўжо атрымалі адпаведныя заданні.

Прэзідэнт адзначыў асаблівую важнасць для беларускай эканомікі такіх прадпрыемстваў, як ААТ «Даламіт» і Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік».

Гаворачы пра пасаду памочніка Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што да людзей, якія займаюць гэту пасаду, «патрабаванні самыя строгія, і яны будуць толькі ўзрастаць». У веданні памочнікаў — галоўных інспектараў па абласцях знаходзіцца работа з кадрамі, а таксама іншыя пытанні развіцця даверанай вобласці. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што памочнік Прэзідэнта — гэта пасада «на вылучэнне», ступень для далейшага кадравага росту.

Цяпер у рэгіёнах краіны ідзе ўборка збожжавых. Гэта найважнейшая кампанія, і яе трэба завяршыць дастойна, сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што мае намер узмацніць кантроль над дзейнасцю сілавых структур. «Незалежных «белых» плям не будзе — усе будуць пад кантролем займацца сваёй справай», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён строга папярэдзіў дзяржаўных служачых аб недапушчальнасці фінансавых махінацый і карупцыйных сувязяў з бізнэсам.

Даючы згоду на назначэнне кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў, Прэзідэнт цікавіўся станам спраў у Мінскай, Магілёўскай абласцях, ходам уборкі ўраджаю.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў прысутных быць сапраўднымі прадстаўнікамі Прэзідэнта. «Вы — твар улады, і гэтым усё сказана», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы пры гэтым, што стаўленне да людзей павінна быць для іх «пытаннем нумар адзін».

БЕЛТА.

ВОДАПРАВОДЫ Ў АГРАГАРАДКАХ

Сёлета запланаваны ўвод у эксплуатацыю 253 аграгарадкоў. Пры гэтым, як паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Мінжылкамгаса Анатоль Шагун, тут павінны быць збудаваныя 74 артэзіянскія свідравіны, 16 воданапорных вежаў, 25 установак абезжалезвання вады, 80 кіламетраў водаправоду, 10 ачышчальных збудаванняў, 21 грамадская лазня, а таксама 1 кацельня.

Планка «камунальных» стандартаў у аграгарадках стала больш высокай. У прыватнасці, пры насельніцтве звыш тысячы чалавек тут павінна прыпадаць не менш за 3 месцы ў лазнях з разліку на жыхароў добраўпарадкавання і 5 месцаў — нядобраўпарадкаванага жылля. Апроч таго, змяніліся патрабаванні да цэнтралізаванага водазабеспячэння. Доступ да яго павінны мець не менш за 50 працэнтаў насельніцтва аграгарадкоў. Як мяркуюць у міністэрстве, менавіта такі паказчык дасць магчымасць усім жыхарам пры жаданні правесці ваду ў свой дом і зрабіць мясцовую сістэму каналізацыі за кошт уласных сродкаў. Дарэчы, нагадаў Анатоль Шагун, на гэтыя мэты вяскоўцы змогуць атрымаць ільготныя крэдыты. Летась такія крэдыты былі выдаткаваны на 10,5 млрд рублёў, а сёлета агульны «крэдытны партфель» можа павялічыцца да 34 мільярдаў.

Як адзначыў Анатоль Шагун, зараз кошт літра вады, паднятай з гарызонту 100 метраў і ачышчанай на станцыі абезжалезвання, цалкам супастаўляльны з коштам літра мінералкі. Аднак планаў па пераходу насельніцтва на 100-працэнтную аплату тут няма.

Сяргей ГРЫБ.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»
проводит 3 августа 2007 года в 10 часов

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О покупке акций ОАО «Центроэнергомонтаж» на баланс Общества.
2. О выплате дивидендов за I полугодие 2007 г.
3. Об оказании благотворительной помощи.

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 24 июля 2007 года по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8 часов 15 минут до 17 часов, перерыв на обед с 12 часов 30 минут до 13 часов 15 минут.

Место проведения собрания: г. Минск, Велосипедный пер., 7.

Время начала проведения собрания — 10 часов.

Время регистрации участников собрания:
в день проведения собрания с 9 часов до 9 часов 45 минут.

Регистрация участников собрания производится по предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров — по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании.

По всем возникающим вопросам, связанным с проведением собрания, информацию можно получить по телефону 298-44-69.

Совет директоров.

Открытое акционерное общество «Белэнергоремналадка» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости»

проводят открытый аукцион на право заключения договора аренды сроком на 5 лет нежилого помещения, расположенного на первом этаже общежития по адресу: г. Минск, пр. Пушкина, 66/43. Общая площадь помещения 246,11 кв.м. Начальная цена права аренды снижена и составляет

11709120 рублей.

Размер задатка составляет 10 % от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок подачи документов и проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Сроки оплаты за право аренды устанавливаются протоколом о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке не позднее 30 дней после завершения торгов и подписания протокола. Помещение сдается в аренду под услуги общепита.

Аукцион состоится 1 августа 2007 г. в 12.00. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 31 июля 2007 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Контактный телефон: (8-017) 227-40-22.

СУ-19 ОАО «Стройтрест 1»

срочно требуются каменщики. Заработная плата высокая. Одиноким иногородним гражданам предоставляем общежитие и прописку в г. Минске.

Обращаться: г. Минск, ул. Красная, 15, тел. (017) 2882203.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 24.07.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 965,89
1 латвійскі лат	4 251,73
1 літоўскі літ	858,48
1 чэшская крона	105,16
1 польскі злоты	787,30
1 расійскі рубель	84,50
1 украінская грыўня	428,70

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,3853
10 UAH	50,4608
1000 BYR	11,8154
EUR	35,1079

Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.07.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБ'ЯЎЛЕНА ТРОХДЗЁННАЯ ЖАЛОБА

Прэзідэнт Польшчы Лех Качынскі вярнуўся з Грэнобля, дзе сустракаўся са сваім калегам Нікаля Сарказі і наведваў шпіталь, у якім знаходзяцца паломнікі, пацярпеўшыя ў аўтакатастрофе.

Як паведамляюць інфармагенцтвы, прэзідэнты дзвюх краін выказалі спачуванні родным загінулых, а Лех Качынскі аб'явіў трохдзённую нацыянальную жалобу. Трагедыя адбылася 22 ліпеня на адной з горных дарог у Альпах. Аўтобус з польскімі паломнікамі зляцеў у прорву з 40-метровай вышыні. У выніку 26 чалавек загінулі. 24 атрымалі пашкоджанні. Паводле папярэдніх даных, прычынай аварыі стала паломка тармазной сістэмы.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне прэзідэнту Польшчы Леху Качынскаму ў сувязі з чалавечымі ахвярамі аўтакатастрофы.

З-ЗА ПАВОДКІ СОТНІ ТЫСЯЧ БРЫТАНЦАЎ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ПІТНОЙ ВАДЫ

З-за паводкі ў выніку праліўных дажджоў была спынена работа станцыі водаачысткі ў горадзе Цьюкзберы (графства Глостэршыр), пасля чаго каля 150 тысяч дамоў засталося без пітной вады, паведамляе тэлеканал Sky News.

Мясцовыя ўлады наладзілі ў пацярпелыя раёны дастаўку пітной вады ў бутэльках. Між іншым з розных раёнаў, якія апынуліся ў зоне бедства, паступаюць паведамленні аб дэфіцыце прадуктаў першай неабходнасці: ён узнік з-за таго, што мясцовыя жыхары актыўна запасаюцца вадой, прадуктамі харчавання, бензінам і іншымі таварамі.

Як паведамляе ВВС, у Глостэры, адміністрацыйным цэнтры графства, з-за аварыі на падстанцыі без свету засталося каля 43 тысяч дамоў. У бліжэйшыя дні стыхійнае бедства закране, як чакаецца, паўночныя раёны краіны. Страты ад паводкі, паводле папярэдніх даных, могуць скласці больш за 4 млрд долараў.

Г. БРАУН: «РАСІЯ ЎСЁ Ж ТАКІ ПАВІННА ВЫДАЦЬ ЛУГАВОГА»

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Гордан Браун лічыць, што Расія павінна выдаць брытанскаму правасуддзю расійскага прадпрымальніка Андрэя Лугавога, які падазраецца Скотланд-Ярдам у забойстве экс-супрацоўніка ФСБ Аляксандра Ліцвіненкі.

З такой заявай брытанскі прэм'ер выступіў падчас прэс-канферэнцыі ў Лондане. Ён таксама адзначыў, што вельмі высока ацэньвае падтрымку ў гэтым пытанні, якую выказалі Вялікабрытаніі Францыя і ЗША.

У гэты ж дзень намеснік генпракурора Расіі па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва Аляксандр Звягінцаў заявіў, што у Генпракуратуры РФ на гэты момант няма дастатковых падстаў для ўзбуджэння крымінальнай справы ў адносінах да Лугавога і пераходу яго са статуса сведкі ў статус падазронага.

ПРОДАЖ НОВАГА РАМАНА ПРА ГАРЫ ПОТЭРА Б'Е ЎСЕ РЭКОРДЫ

Заключная кніга «патэрыяны» за лічаныя гадзіны стала бестселерам: за суткі па ўсяму свету было прададзена 15 млн экзэмпляраў. У Маскве кніга «Гары Потэр і ракавыя мошчы» разыходзілася з хуткасцю 10 асобнікаў у хвіліну.

Кожная пятая прададзеная кніга знайшла свайго чытача ў Вялікабрытаніі, піша газета The Sun. Як паведамляе гандлёвы дом WH Smith, іх кнігі прадаваліся з хуткасцю адзін экзэмпляр у 15 секунд, а гандлёвая сетка Asda за два дні пазбавілася ад паўмільёна тамоў пра Гары Потэра. Продаж новага рамана перавысіў продаж папярэдняй кнігі пра юнага мага ўдвая.

ISSN 1990 - 763X

«Прамая лінія»

«ПРАЦОЎНЫЯ» ПЫТАННІ. З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Асноўнай нагодай для правядзення нашай чарговай «прамой лініі» сталі звароты ў рэдакцыю ў сувязі з прыняццем парламентам змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс. Зрэшты, ужо пасля першых папярэдніх званкоў стала зразумела, што толькі гэтым справа не абмяжуецца. Кантракты і водпускі, налічэнне заробкаў і правілы прыёму на работу, гарантыі інвалідам і асаблівасці працаўладкавання жанчын, якія даглядаюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — такімі аказаліся толькі некаторыя і найбольш «папулярныя» тэмы гадзіннай размовы.

Але аб усім па парадку. Такім чынам, на пытанні чытачоў «Звязды» адказвае начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Інэса Мечыславаўна ЧЫСЦЯКОВА.

☎ — У нашай арганізацыі кантракты амаль з усімі працягваюцца толькі на год. Ці правільна гэта? І, у прыватнасці, ці павінны кантракты з высокакваліфікаванымі работнікамі, якія да таго ж маюць вялікі стаж, працягвацца на 3 гады?

Вячаслаў Іосіфавіч Крыпель, *Шчучынскі раён*

— Заканадаўствам вызначаны толькі мінімальны і максімальны тэрміны дзеяння кантрактаў — 1 і 5 гадоў адпаведна. Пры гэтым пытанні заключэння ці працягу кантрактаў з высокакваліфікаванымі работнікамі, якія маюць працяглы стаж у арганізацыі, на заканадаўчым узроўні не ўрэгуляваныя. Словам, заключэнне кантрактаў з такімі работнікамі як мінімум на 3, а максімум на 5 гадоў будзе абавязковым толькі тады, калі гэта норма замацавана ў калектыўным дагаворы вашай арганізацыі.

☎ — З 1 кастрычніка 2004 года стала працаваць у школе кіраўніком гуртка, а крыху пазней на 0,5 стаўкі — яшчэ і настаўнікам. Як кіраўнік гуртка маю права на 42, а як настаўнік на 56 каляндарных дзён водпуску. Аднак зараз узнікла такая сітуацыя. З 15 жніўня я вырашыла звольніцца. Пры гэтым, паколькі да поўнага года работы ў якасці кіраўніка гуртка мне не хопіць 1,5, а ў якасці настаўніка — 2,5 месяца, сёлетні водпуск мне вырашылі прадаставіць прапарцыянальна адпрацаванаму часу — у памеры 44 каляндарных дзён. Гэта правільна?

І другое пытанне. Калі ў нас адбудзецца чарговае павелічэнне тарыфнай стаўкі 1-га разраду бюджэтнікам?

Ганна Фёдараўна Даманеўская, *г. Мінск*

— У арганізацыі, дзе вы працуеце, зрабілі няправільна. Рэалізацыя права на другі і наступныя працоўныя водпускі не залежыць ад наяўнасці звестак аб будучым скасаванні працоўнага дагавора. І сама па сабе гэта акалічнасць не дае падстаў для прадастаўлення водпуску прапарцыянальна адпрацаванаму часу.

Што ж да другога пытання, то скажу шчыра: сёння тэрміны чарговага павелічэння тарыфнай стаўкі І разраду бюджэтнікаў не вызначаны.

☎ — У чэрвені 2005 года ўладкавалася на работу. Праз пэўны час атрымала першы працоўны водпуск. Аднак сітуацыя склалася так, што затым я знаходзілася амаль 5 месяцаў у водпуску без захавання зарплаты. З улікам гэтага патлумачце, калі права на працоўны водпуск з'явіцца ў другі раз?

Святлана, *г. Віцебск*

— Перыяд, калі вы знаходзіліся ў водпуску без захавання зарплаты, за выключэннем 14 каляндарных дзён у рабочы год не ўваходзяць. Інакш кажучы, пачатак другога працоўнага года ў вас зрушыўся — з чэрвеня практычна на пачатак снежня. Такім чынам, поўнага года зараз сапраўды не атрымліваецца.

Праўда, тут ёсць адзін нюанс. Паводле нашага заканадаўства, другі і наступны працоўны водпуск можа прадастаўляцца незалежна ад таго, колькі часу адпрацавана на працягу працоўнага года. Аднак пры гэтым канкрэтны тэрмін вашага другога водпуску павінен вызначацца графікам.

☎ — Ці могуць існаваць розныя тарыфныя стаўкі ў адным і тым жа акцыянерным таварыстве і, у прыватнасці, на галаўным прадпрыемстве і ў філіяле? Ці ёсць у нас адзіная, зацверджаная ўрадам, тарыфная стаўка для вартаўніка 5-га разраду?

І яшчэ. Раней выхады на работу ў нас лічыліся па днях, а зараз — па гадзінах. Скажам, поўная норма за год складае 2022 гадзіны, або па 8 гадзін у дзень. Між тым, часцяком водзіцца выходзіць па суботах, а падчас пасяўной, нарыхтоўкі кармоў і жніва — працаваць па 10 гадзін у дзень. У бухгалтэрыі кажуць, што за ўсе перапрацоўкі, з улікам колькасці гадзін, можна браць адгулы. Ці правільна гэта? І ці павінны перапрацоўкі аплачвацца ў двайным памеры?

Аляксандр Васільевіч, *Гродзенскі раён*

— Сапраўды, у камерцыйных арганізацыях, і ў тым ліку ў акцыянерных таварыствах, могуць выкарыстоўвацца некалькі тарыфных ставак 1-га разраду для аплаты працы работнікаў, калі гэта прадугледжана калектыўным дагаворам або іншым лакальным нарматыўным актам. Гэта па-першае.

Па-другое. Тарыфная стаўка вартаўніка 5-га разраду будзе адзінай толькі для арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту. У дадзеным выпадку яна вызначаецца шляхам памнажэння тарыфнай стаўкі 1-га разраду для арганізацый, што фінансуюцца з бюджэту (зараз — 65 тыс. рублёў), на тарыфны каэфіцыент 5-га разраду Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў (1,73) і складае 112 450 рублёў.

Аднак што да камерцыйных арганізацый, і ў тым ліку акцыянерных таварыстваў, то памер тарыфнай стаўкі вартаўніка 5-га разраду вызначаецца шляхам памнажэння тарыфнай стаўкі 1-га разраду, прынятай у канкрэтнай арганізацыі, на тарыфны каэфіцыент 5-га разраду Адзінай тарыфнай сеткі (1,73). Такім чынам, варта паўтарыцца, што зыходны пункт тут — «уласная» тарыфная стаўка арганізацыі, якая вызначаецца паводле эфектыўнасці яе работы і фінансавага стану.

І нарэшце. Калі гаворка ідзе аб рабочым раслінаводства або арганізацыі сельскай гаспадаркі, пытанні «кампенсацыі» за перапрацоўку рэгулююцца артыкулам 317 Працоўнага кодэкса. Паводле гэтага артыкула, такім работнікам устанаўліваецца сумараваны ўлік працоўнага часу за гадавы ўліковы перыяд (каляндарны або разліковы год), пры якім наймальнік мае права ў перыяд напружаных палявых работ (пасяўная, догляд пасеваў, нарыхтоўка кармоў, уборка ўраджаю і г.д.) у выпадку неабходнасці павялічваць працягласць штодзённай работы ці змены да 10, а са згоды работніка — да 12 гадзін. А перапрацоўка, што ўзнікае ў выніку, можа кампенсавацца наймальнікам шляхам змяншэння працоўнага дня ці змены ў іншыя перыяды ці ў зімовы час або кампенсавацца прадастаўленнем іншых дзён адпачынку — з разліку адзін дзень за 8 гадзін перапрацоўкі. Прычым дадзеная перапрацоўка аплаце ў двайным памеры не падлягае.

Сяргей ГРЫБ.

(Працяг будзе).

ЧАС РЫХТАВАЦЬ ПЕРШАКЛАСНІКА Ў ШКОЛУ

Самыя клапатлівыя бацькі ўжо зараз прыглядаюцца да тавараў, якія спатрэбяцца дзеткам у новым навучальным годзе. Асабліва адказна падыходзяць да гэтага бацькі тых дзяўчынак і хлопчыкаў, якія сёлета збіраюцца «першы раз у першы клас». Як падрыхтаваліся сталічныя крамы да прыёму пакупнікоў? З гэтым пытаннем мы звярнуліся ў Галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Усе падрабязнасці — ад начальніка аддзела гандлю нехарчовымі таварамі Аксаны КАНСТАНЦІНОВІЧ:

— Гандлёвыя арганізацыі гатовы забяспечыць пакупнікоў надзвычай шырокім асартыментам тавараў для школьнікаў, возьмем хоць бы адзенне: каля 130 мадэляў — для дзяўчынак і прыблізна столькі ж — для хлопчыкаў. Гэта вынік сумеснай працы прамысловых прадпрыемстваў і органаў гандлю, адукацыі і аховы здароўя. Мы праглядвалі калекцыі, раіліся, удакладнялі, якія мадэлі патрэбны і ў якой колькасці.

Паводле слоў Аксаны Валер'еўны, сёлета ў школьным адзенні будзе дамінаваць шэра-чорная строгая гама: мноства яркіх мадэляў не прайшлі «экспертызу» органаў адукацыі на адпаведнасць дзелавому стылю.

Асноўныя вытворцы адзення для школьнікаў на беларускім рынку — салігорская «Калінка», бабруйская «Славянка», гомельскі «Камінтэрн», баранавіцкая «Бараўчанка» і «Навагрудская швейная фабрыка». Трыкатажныя вырабы паступаюць з пінскага «Палесся» і жодзінскага «Світанка», а школьную скураную галантарэю пастаўляюць сталічныя прадпрыемствы «Галантэя» і «Каджыя». Бацькоў заўсёды цікавіць састаў тканін, з якіх шыецца адзенне для малых: чым менш там сінтэтыкі, тым лепш.

— Сёння не трэба апасацца сінтэтычных тканін, — супакойвае Аксана Валер'еўна, — адзенне, створанае з іх, стала больш гігіенічным дзякуючы сучасным тэхналогіям, акрамя таго яно і больш практычнае: даўжэй носіцца і лепш адмываецца. Пры гэтым прамысловыя прадпрыемствы маюць на такое адзенне пасведчанні гігіенічнай рэгістрацыі Міністэрства аховы здароўя.

Падбор школьнага адзення для свайго маленькага непаседы — задача, відаць, самая складаная з усіх школьных закупак, аднак далёка не адзіная. Трэба паклапаціцца таксама пра абутак, спартыўнае адзенне, красоўкі ці кеды, канцтавары і які-небудзь рукзачок, у які тыя канцтавары можна будзе пакласці, пажадана з аздабленнем флікерамі. Поўны камплект першакласнікі абыдзецца бацькоўскай кішэні ў 190 — 515 тысяч рублёў, з іх толькі на стандартны набор — сшыткі-лічыльныя палачкі-фарбы і гэтак далей — пойдзе 35 — 270 тысяч рублёў.

Засталося, мабыць, апошняе пытанне, куды падацца па пакупкі?

— 39 крам толькі ў Мінску здзяйсняюць пашыраны продаж школьных тавараў, 350 арганізацый гандлю прадаюць асобныя віды канцылярскіх тавараў, — пералічвае Аксана Валер'еўна, — школьныя базары працуюць пры ўнівермагах ГУМ, ЦУМ, «Кірмаш», «Беларусь», «На Нямізе». Створана таксама 40 куткоў першакласнікаў. Плануецца мноства рэкламна-забаўляльных мерапрыемстваў, выставак-продажаў і дэманстрацый, у тым ліку традыцыйны кірмаш «Прывітанне, школа!». Кірмаш запланаваны ва ўсіх раёнах горада, на пляцоўцы ля Палаца спорту (там возьмуць удзел больш як 60 прадпрыемстваў гандлю) і ў «Бел-Экспа» (з удзелам прамысловых прадпрыемстваў).

Камітэт па адукацыі падлічыў, што ў першы клас сёлета пойдзе звыш 15 з паловай тысяч першакласнікаў, а гэта на 4,5 тысячы больш, чым летась, таму наша вам парада, шаноўныя бацькі, не адкладвайце пакупкі на апошні жніўеньскі дзень, бо выбар давядзецца рабіць, як кажуць, з таго, што засталося, а даўжэзныя чэргі яго толькі ўскладняць.

Каб дапамагчы чытачам зрабіць пакупкі, мы наведалі адно з тых месцаў, дзе вашага першаклашку можна экіпіраваць па-поўнай, — Гандлёвы дом «На Нямізе». Як гэта лепш зрабіць і на што варта звярнуць увагу, раскажа **Наталля КУНІЦКАЯ, намеснік начальніка камерцыйнай службы:**

— Днямі ў Гандлёвым доме пачаўся пашыраны продаж тавараў да школьнага сезона. Мы прапануем пакупнікам новую калекцыю абутку вытворчасці беларускіх прадпрыемстваў «Марко», «Сівельга», а таксама некаторых расійскіх кампаній — знойдзецца абутак і на кожны дзень, і для заняткаў фізкультурай. Мадэлі модныя, якасныя, а галоўнае — даступныя па кошце: ад 28 да 86 тысяч рублёў.

У секцыі «Тавары для дзяцей» ёсць магчымасць выбраць для будучых школьнікаў абутак і адзенне на свой густ з амаль 200 прапанаванымі мадэляў. Касцюмчык для маленькага байца можна набыць за 46—100 тысяч рублёў, а камплекцік для юнай прынцэскі — за 67—100 тысяч.

Паводле назіранняў прадаўцоў, мамы і таты найбольш ахвотна набываюць для дачок паўшарсцяныя камплекты-троечкі (жакецік, спадніца і штаны) ад «Світанка» і вельветавыя сарафаны, а для хлопцаў купляюць часцей касцюмы вытворчасці «Камінтэрна» і «Навагрудскай швейнай фабрыкі».

«На Нямізе» раяць асвяжыць стрыманыя колеры школьных касцюмаў джэмперамі больш вясёлых адценняў — іх варта пашукаць у секцыі «Дзіцячая бялізна», дзе прадстаўлена прадукцыя «Палесся», «Ром Гіль» і іншых айчынных прадпрыемстваў.

Аддзел «Галантарэя» парадуе бацькоў і іх дзетак багатым выбарам ранцаў і рукзакоў, мадэлі для навучэнцаў пачатковай школы каштуюць ад 25 да 100 тысяч рублёў.

Ужо зараз гандаль ідзе вельмі бойка: штодзень прадаецца 40 — 50 хлапчуковых касцюмаў, 80—90 сарочак, а для дзяўчат — 25—30 касцюмаў і прыблізна столькі ж блузак. Уявіце сабе, што будзе ў жніўні!



ДЗЕ ВЫГАДНА КУПЛЯЦЬ?

● ***У ГУМе*** *з 1 па 31 жніўня будзе дзейнічаць 10-працэнтная скідка на адзенне і абутак, а пры набыцці тавараў школьнага асартыменту на суму 350 і больш тысяч рублёў можна атрымаць крэдыт на тэрмін ад 3 да 12 месяцаў да 12 працэнтаў .*

● *Адзенне мінулых гадоў можна набыць па танным кошце і ва* ***ўнівермагу «Беларусь»****, скідка на яго складае 10 працэнтаў.*

● *Да 20 працэнтаў будуць зніжаны цэны для шматдзетных сем'яў і тых, хто выхоўвае дзяцей-інвалідаў, на тавары* ***фірменнай абутковай крамы «Прамень»*** *з 1 па 30 жніўня — у час дзеяння акцыі «Хутка ў школу».*

● *Калі вы збіраецеся патраціць на канцтавары звыш 50 тысяч рублёў, на скураныя галантарэйныя вырабы — звыш 60 тысяч, а на трыкатажную прадукцыю — звыш 70 тысяч, то выгадна зрабіць гэта ў краме* ***«Старт-Х»****, бо там пакупнікі атрымліваюць за гэта падарункі.*

Універмаг, безумоўна ж, рыхтуецца да жнівеньскага «штурму»: установяць дадатковыя разліковыя вузлы ў секцыях дзіцячага адзення і канцтавараў, ды і новае гандлёвае абсталяванне размесцяць (у прыватнасці, паліцы). У секцыях, найбольш запатрабаваных напярэдадні школьнага сезона, у паўтара раза павялічаць колькасць прадаўцоў. Тым не менш, у гандлёвым доме папярэджваюць: чым раней вы зойдзецеся пакупкамі, тым лягчэйшы будзе шопінг. Са свайго боку ўнівермаг прывабліве пакупнікоў скідкамі: на некаторыя мадэлі дзіцячых швейных вырабаў удвая зніжана гандлёвая надбаўка, што аўтаматычна памяншае кошт на 10—11 працэнтаў. Акрамя таго «На Нямізе» выгадна рабіць пакупкі ў першую і апошнюю гадзіны працы, бо дзейнічае 2-працэнтная скідка. У хуткім часе плануецца дысконтная скідка ў адзін працэнт для тых, хто будзе расплачвацца пластыкавай карткай. Акрамя таго, тавары для школьнікаў можна набываць у крэдыт, прычым непатрэбны ні паручыцелі, ні першапачатковы ўзнос.

Ва ўнівермагу будзе праведзена 15 пашыраных выставак-продажаў швейных, трыкатажных, галантарэйных тавараў, традыцыйны кірмаш «Прывітанне, школа!». Ну і самае цікавае — дэманстрацыі адзення ад «Калінкі», «Славянкі», «Камінтэрна», «Палесся», «Бараўчанкі» і іншых прадпрыемстваў. Паказы мадэляў Гандлёвы дом ладзіць па сваёй ініцыятыве і абыдзецца выключна ўласнымі сіламі, нават мадэлі на імправізаваным подыуме будуць «свае» — адзенне прадэманструюць дзеткі супрацоўнікаў.

Інфармацыю пра скідкі, распродажы, дэманстрацыі мадэляў і іншыя акцыі «На Нямізе» шукайце на сайце www.td-nanemige.by, звяртайце увагу на вонкавую рэкламу і прыслухоўвайцеся да апавяшчэнняў па ўнутраным радыёвузле. Прыемных і ўдалых вам пакупак!

Ала МАЧАЛАВА. Фота аўтара.

На кантролі ўрада

Дзіцячае харчаванне: і смачна, і карысна

На Шчучынскім масласырзаводзе завяршаецца рэалізацыя праекта арганізацыі вытворчасці сыраватачна-бялковага канцэнтрату. Гэта канкрэтны і важны крок па выкананню прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі» на 2006—2010 гады. Згодна з ёй, вытворчасць гэтага канцэнтрату была наладжана ў г. Бярозе Брэсцкай вобласці. А на сёлетні снежань запланаваны ўвод цэха ў Шчучыне.

Паводле інфармацыі дырэктара прадпрыемства Мікалая Максімовіча, абястлушчаны сыраватачна-бялковы канцэнтрат (у яго сухім астатку ўтрымліваецца 80—85 працэнтаў бялку) — прадукт вельмі каштоўны. Ён выкарыстоўваецца ў якасці замяняльніка яечнага бялка ва ўзбіваемых харчовых прадуктах і фруктовых напоях, у марожаных дэсертах, напаўняльніках для ёгурту, пры вытворчасці дзіцячага харчавання. Выкарыстанне канцэнтраваных бялкоў малочнай сыроваткі не толькі паляпшае смак, але і дае магчымасць стварыць прадукт, які аптымальна засвойваецца арганізмам чалавека з адначасовым зніжэннем каларыйнасці гэтага прадукту.

Інвестыцыйныя затраты на гэты праект, які дазволіць заводу эфектыўна выкарыстоўваць малочную сыроватку і стварыць дадатковыя рабочыя месцы, складаюць каля 30 мільярдаў рублёў. Абсталяванне магутнасцю 200 тон сыраватачна-бялковага канцэнтрату ў год закуплена ў шведскай фірмы TETRA PAK, і цяпер спецыялісты са Швецыі завяршаюць яго мантаж. Шчучынскі масласырзавод будзе пастаўляць сыраватачна-бялковы канцэнтрат у Ваўкавыск прадпрыемству «Беллакт» для вытворчасці дзіцячага харчавання, а таксама адгружаць на экспарт.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Свая справа

ДЗЯРЖАВА ДАЛА ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ КРЫЛЫ... У 10-ы РАЗ!

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Імёны самых паспяховых бізнэсмэнаў па выніках мінулага года былі абвешчаны ўжо даўно — з падпісаннем Указа Прэзідэнта «Аб пераможцах і лаўрэатах рэспубліканскага конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2006 года», а ўрачыстае ўзнагароджанне прайшло ў мінулую пятніцу. Прадпрымальнікі атрымалі традыцыйныя статуэткі-крылы (распрацаваныя Генадзем Буралкіным і выкананыя кампаніяй «Выдатнае ліццё») з рук прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага. Кіраўнік урада павіншаваў бізнэсмэнаў і падзякаваў ім за плённую працу.

— Нягледзячы на тое, што патрабаванні сталі больш жорсткімі, колькасць удзельнікаў конкурсу выраслa, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Калі на мінулых конкурсах адбор пачынаўся з 450 удзельнікаў, то сёлета іх звыш 900. Павялічылася і колькасць намінацый у сувязі з ростам колькасці прадпрымальнікаў у розных сферах бізнэсу — вытворчасці, высокіх тэхналогій і іншых. Пашырылася геаграфія пераможцаў і лаўрэатаў конкурсу, з якіх кожны чацвёрты вядзе сваю справу ў сельскай мясцовасці, малых і сярэдніх гарадскіх населеных пунктах. Уклад прадпрымальнікаў у развіццё беларускай эканомікі расце. У 2006 годзе толькі суб'екты малога прадпрымальніцтва стварылі каля 9 працэнтаў унутранага валавога прадукту і больш як 7 працэнтаў прамысловай прадукцыі.

Паводле прагнозаў урада, у 2010 годзе ў сферы малога прадпрымальніцтва будзе заняты кожны пяты ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы (сёння — кожны сёмы).

Сяргей Сідорскі дадаў таксама, што ўдзел прадпрымальніцтва заахвочваецца і ў найбольш прыярытэтных накірунках для дзяржавы, такіх, як інавацыйнае развіццё, забеспячэнне энергетычнай бяспекі краіны, імпартазамяшчэнне, умацаванне экспартнага патэнцыялу краіны, адраджэнне і развіццё вёскі, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў.

— У самых блізкіх планах урада — меры па далейшаму стымуляванню развіцця прадпрымальніцтва ў сферах падаткаабкладання, ліцэнзавання, рэгістрацыйных і іншых адміністрацыйных працэдур, — запэўніў Сяргей Сідорскі.

Прынамсі, цырымонія была юбілейнай — 10-й па ліку, таму трапіць у спіс пераможцаў і лаўрэатаў яшчэ больш ганарова. Гэтага шанца сёлета былі пазбаўлены тытунёвыя кампаніі — прасочваецца дзяржаўная ўстаноўка на здаровы лад жыцця. У 16 намінацыях было названа толькі 12 пераможцаў: у галіне грамадскага харчавання, турызму, фізкультурна-аздараўленчых паслуг і фермерскай гаспадаркі аказаліся толькі лаўрэаты. Пераможцамі сталі вытворцы харчовых і нехарчовых тавараў, прадпрымальнікі ў сферах будаўнічай і медыцынскай дзейнасці, гандлю, аказання паслуг. Быў названы лепшы прадпрымальнік — арганізатар новых рабочых месцаў (Валерый Поткін — гендырэктар прадпрыемства «ЭЛЬВІРА»), а таксама найлепшы банк па аказанню паслуг прадпрымальнікам — ім стаў «Белгазпрамбанк» (старшыня праўлення — Віктар Бабарыка).

Апроч іншых падарункаў, для самых паспяховых прадпрымальнікаў падрыхтавалі святочны канцэрт з удзелам ансамбля «Лянок», Алега Сямёнава — лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне», віртуознага баяніста Паўла Неўмяржыцкага, Іны Афанасьевай, якая цяпер можа пахваліцца званнем народнай артысткі Беларусі, Якава Навуменкі і многіх іншых артыстаў.

Вялі ўрачыстасць Яўген Лашкоўскі і Алена Спірыдовіч. Знаёмілася з прадпрымальнікамі карэспандэнт «Звязды». Якія рэцэпты паспяховасці ў прыватнай справе прапануюць нашым чытачам найлепшыя бізнэсмэны краіны?

НАСТОЙЛІВАСЦЬ, ПРАЦАЛЮБСТВА І КРЫХУ ТАЛЕНТУ

Ігар СЕРГІЕНКА — гендырэктар кампаніі «Берліо» — шчаслівы чалавек, бо займаецца любімай справай:

— Я заўсёды марыў быць распрацоўшчыкам, электроншчыкам — так і атрымалася, — прызнаецца ён.

Ігар Сергіенка выглядае як тыповы бізнэсмэн — салідны і паважны, з тэлефонам, на які бясконца паступаюць выклікі, і бесправадной гарнітурай, якая дазваляе размаўляць па тэлефоне, не трымаючы яго ў руках, — а паводзіць сябе Ігар Юр'евіч надзвычай натуральна, сустракае суразмоўцу ветлівым позіркам і шчырай усмешкай. Пра ўдзел у конкурсе кажа, што стараўся не для перамогі, проста праца яму падабаецца. Такое стаўленне не магло не прынесці плён: летась Ігар Юр'евіч быў названы лаўрэатам нацыянальнага конкурсу прадпрымальнікаў, а сёлета ён ужо ў авангардзе — пераможца ў намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці тавараў прамысловага прызначэння».

З вынікамі яго працы, пэўна, добра знаёмы аўтаўладальнікі: гэта камп'ютарная сістэма, якая аўтаматызуе дзейнасць заправак. Сістэма не толькі дазваляе ўладальнікам весці ўлік тавараў, бухгалтэрыю, але і дае магчымасць кліентам спрасціць карыстанне паслугамі запраўкі. Дзякуючы спецыяльнай картцы, аўтамабіліст можа самастойна заправіцца — яму нават не давядзецца звяртацца да аператара. Кампанія таксама наладжвае ўзаемадзеянне паміж рознымі запраўкамі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Карыстальнікі картак «Берліо» могуць запраўляцца ва Украіне, у Расіі, Германіі, Польшчы, Чэхіі і іншых краінах. Усяго кампанія ахапіла 9 дзяржаў, але на гэтым Ігар Сергіенка спыняцца не збіраецца — на тое ён і лепшы прадпрымальнік. На думку Ігара Юр'евіча, сакрэт поспеху ў бізнэсе — настойлівасць плюс працалюбства, плюс крыху таленту. «Няблага пры гэтым яшчэ апынуцца ў патрэбным месцы ў належны час», — дадае бізнэсмэн.

— Калі нечага хочаш і прыкладваеш намаганні, то раней ці пазней даб'ешся свайго, — запэўнівае нас прадпрымальнік.

ВЫДАТНАЯ ПРАЦА КАЛЕКТЫВУ

Яшчэ адзін дэбютант-пераможца на конкурсе — **Дзмітрый ДЗІЧКОЎСКІ, генеральны дырэктар «МІЛАВІЦЫ»** — імпазантны і неверагодна абаяльны мужчына. Прадукцыя прадпрыемства не мае патрэбы ў прадстаўленні, таму звернемся да асобы дырэктара. У размове з намі Дзмітрый Анатольевіч, найлепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці спажывецкіх тавараў, падзяліўся мудрай і крыху сціплай высновай — перамогай ён абавязаны выдатнай працы свайго калектыву, і ўспрымае гэта як конкурс на самае лепшае прадпрыемства:

— Гэта перамога не індывідуума, а вялікай каманды «МІЛАВІЦА».

У супрацоўніках Дзмітрый Дзічкоўскі цэніць прафесіяналізм, адкрытасць, прыстойнасць. Для паспяховага бізнэсу, на яго думку, важна выразна ўсведамляць, у якім накірунку павінна развівацца прадпрыемства, прагназаваць, якім чынам будзе змяняцца адпаведная галіна вытворчасці, адчуваць патрэбы рынку. У самы блізкі час «МІЛАВІЦА» парадуе жанчын новымі калекцыямі, крамамі, індывідуальнымі, эксклюзіўнымі рэчамі — яркімі і прыгожымі.

ПРА СПРАВУ ДУМАЕШ НАВАТ НОЧЧУ

Лаўрэатам у намінацыі «Лепшая сялянская (фермерская) гаспадарка» стаў **кіраўнік гаспадаркі «Канстанцін» у вёсцы Карзеева Магілёўскай вобласці Васіль РАЗУМАЎ** — просты, шчыры, добразычлівы чалавек. Ён у сваёй справе дока:

— Сферу гэту ведаю дасканала: з 1965 года заняты ў гаспадарчай галіне. Ад пачатку да канца прытрымліваюся тэхналогіі, тэхніка на належным узроўні ды людзі азадачаны — вось вам і вынік.

Сакрэт свайго поспеху бачыць у няспыннай працы і ў тым, што думкі аб справе не даюць спакою нават ноччу. У планах на самую блізкую будучыню ў сёлетняга лаўрэата — выйсці на ўзровень ураджаю да 80 цэнтнераў, удасканаліць саму базу, пабудаваць усё неабходнае, «каб звароту назад не было, а спадкаемцы працягвалі справу». Васіль Яўгенавіч ужо рыхтуе сабе змену:

— Сын заўсёды побач, дапамагае.

На думку Васіля Разумава, весці гаспадарку вельмі цяжка — не кожны пацягне фермерскую справу: аднаго жадання мала, патрэбна незлічоная колькасць ведаў.

— Фермерам трэба нарадзіцца! — перакананы Разумаў.

Увагай і падтрымкай дзяржавы, лічыць фермер, гаспадарка не абдзелена:

— Нам былі выдаткаваны з бюджэту сродкі на дызельнае паліва, тэхніку ў лізінг выдзяляюць. Ну а астатняе, самім зарабіць трэба. Прадпрымальнікам сёння шырокі шлях, галоўнае па ім правільна ісці.

ПАКУЛЬ МУЖЧЫНА ПАВЕРНЕЦЦА, ЖАНЧЫНА ТРЫ РАЗЫ ПЕРАКРУЦІЦЦА

Спрытная, жвавая і вясёлая **Антаніна ВЯЛІЧКА** — адзіная жанчына сярод пераможцаў. Яна ўзначальвае інфармацыйна-кансультацыйнае прадпрыемства «Наваполацкі цэнтр прадпрымальніцтва і нерухомасці «. Прычым робіць гэта настолькі ўдала, што сёлета перамагла ў намінацыі «Лепшы суб'ект інфраструктуры падтрымкі і развіцця прадпрымальніцтва». Бізнэсвумэн і яе калегі дапамагаюць прадпрымальнікам стартаваць — кансультуюць, афармляюць неабходныя дакументы, высветляюць пытанні з падаткамі. У далейшым цэнтр аказвае прадпрымальнікам паслугі па ацэнцы нерухомасці, правядзенні аўкцыёнаў.

З тым, што ў бізнэсу, бачыце, не жаночы твар, Антаніна Аляксандраўна абсалютна не згодная:

— Часам пакуль мужчына павернецца, жанчына тры разы перакруціцца! Калі чалавек актыўны, энергічны, то няважна, мужчына гэта ці жанчына.

Наадварот, у бізнэс-лэдзі, паводле меркавання Антаніны Аляксандраўны, ёсць шэраг пераваг:

— Нас лягчэй сустракаюць, нам прасцей выклікаць да сябе прыхільнасць.

Антаніна Вялічка лічыць, што ў сферы падтрымкі прадпрымальніцтва дзяржаве яшчэ ёсць над чым працаваць — асабліва ў накірунку павелічэння прэферэнцый.

***

Быць простым выканаўцам, ад якога, па сутнасці, не так шмат і залежыць, безумоўна прасцей, чым весці ўласную справу: і адказнасці менш, і турбот. Толькі вось і задавальнення не так шмат, а разам з ім і аддачы, і карысці для грамадства. Выдатна, што з кожным годам ініцыятыўных і прадпрымальных становіцца ўсё больш. Віншуем сёлетніх пераможцаў і лаўрэатаў, якія паказалі цудоўныя вынікі, жадаем ім поспехаў і моцных канкурэнтаў, якія б актывізавалі і стымулявалі новыя перамогі.

Ала МАЧАЛАВА.

Факт

Павялічваюцца і пасажырскі, і транспартны, і таварны патокі

Пачынаючы з 2002 года, рост выдадзеных мытных дазволаў усіх відаў у зоне дзейнасці Гродзенскай рэгіянальнай мытні склаў больш за 51 працэнт. Пры гэтым узрастаюць плацяжы ад гандлёвага абароту.

Паводле інфармацыі прэс-групы Гродзенскай рэгіянальнай мытні, ад знешнегандлёвай дзейнасці суб'ектаў гаспадарання ў першым паўгоддзі ў бюджэт краіны паступіла мытных плацяжоў на суму 130 мільярдаў рублёў. А ўвогуле ад дзейнасці мытні — 202,9 мільярда рублёў. Такім чынам, план выкананы на 125 працэнтаў, а скарэкціраванае ў чэрвені заданне — на 107 працэнтаў. За два кварталы сёлета мытня аформіла і накіравала ў адрас расійскіх мытных органаў 80,8 тысячы партый тавараў. Фактычны рост транзітных перавозак у Расійскую Федэрацыю ў параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года склаў 53 працэнты. На працягу апошніх гадоў узрастае і колькасць афармленняў аўтатранспартных сродкаў, якія набываюцца фізічнымі асобамі за межамі Беларусі. За студзень—чэрвень увезена больш за 31 600 аўтамабіляў, што на 33 працэнты перавышае паказчык за той жа перыяд мінулага года.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ НА 10-М ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже объектов республиканской собственности 30 августа 2007 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Грузовой Урал-43202 ш. 021408, дв. 565113	г. Гродно в/ч 16377	1984	27673	10 000 000	1 000 000
2.	АЦ-8-500А з.н. 713564, ш. 11531, дв. 201850	г. Береза в/ч 23324	1971	24505,5	6 000 000	600 000
3.	АТМЗ-5,5-4310(М) з.н. 840104, ш. 002246, дв. 0532600	п. Красный Берег, в/ч 55461Ф (ф-л в/ч 55461/2 г. Калинковичи)	1984	9832	13 000 000	1 300 000
4.	АТМЗ-5,5-4310(М) з.н. 891003, ш. 0005620, дв. 0502289	п. Красный Берег, в/ч 55461Ф (ф-л в/ч 55461/2 г. Калинковичи)	1989	10587	51 000 000	5 100 000
5.	АТМЗ-5,5-4310(М) з.н. 880618, ш. 0045594, дв. 0269229	п. Красный Берег, в/ч 55461Ф (ф-л в/ч 55461/2 г. Калинковичи)	1988	29942	17 500 000	1 750 000

10-й аукцион состоится в 11.00 30 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 28 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 31 августа 2007 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.** Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com e-mail: info@belspeckontrakt.com.

Старажытнаму гораду — сучасны аўтавакзал

У Слуцку пасля поўнага завяршэння рэканструкцыі адчыніў свае дзверы аўтавакзал — першы рэканструяваны аўтавакзал у Мінскай вобласці.

Будынак самога аўтавакзала аднавілі яшчэ да Дажынак, якія праходзілі ў Слуцку ў 2005 годзе. Планы па рэканструкцыі былі грандыёзнымі, але ў той момант сродкаў хапіла толькі на рамонт і аддзелку будынка. Здавалася б, што гэтага і дастаткова, але ўлады не сталі спыняцца і амаль праз два гады аснасцілі вакзал суперсучасным, адзіным у рэспубліцы інфармацыйным электронным табло. Яно выраблена вядучым прадпрыемствам Беларусі па стварэнню аўтаматызаваных сістэм упраўлення Дзяржаўным навукова-вытворчым аб'яднаннем «АГАТ». Пасажырам сёння стала як ніколі зручна карыстацца вакзалам, бо табло ў рэжыме рэальнага часу дае даведку пра наяўнасць білетаў у касах, выводзіць інфармацыю аб прыбыцці і адпраўленні аўтобусаў, а бягучы радок паведамляе аб усіх змяненнях у раскладзе руху аўтобусаў.

У цэлым на рэканструкцыю Слуцкага аўтавакзала было затрачана Вr3 мільярды. Лічбы лічбамі, але сапраўдную карысць і сапраўдную радасць ад новага сучаснага аўтавакзала можна было заўважыць на тварах галоўных удзельнікаў адкрыцця, тых, каму сёння даводзіцца там працаваць, тых, для каго Слуцк становіцца ці перавалам, ці пачаткам новай аўтобуснай вандроўкі. Для іх была праведзена праграма адкрыцця, але нават у той момант вакзал не пераставаў жыць, і адразу пасля афіцыйнай часткі каля кас выстраілася чарга. Жыццё на Слуцкім аўтавакзале зноў закіпела. І хтосьці з афіцыйных гасцей пажадаў, каб так яно было кожны дзень. Але людзі гэтага не пачулі, яны збіраліся ў дарогу.

Вольга КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **16 дзён**

Самая патрэбная энцыклапедыя

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Калі прыходзяць госці, гэта прыемна, а калі яны вашы даўнія прыхільнікі — прыемна ўдвая. Учора ў рэдакцыю завіталі аматары нашай газеты — прадстаўнікі адразу двух грамадскіх аб'яднанняў «Усходняя рабочыя» і «Надзея». Прыйшлі яны не з пустымі рукамі: падарылі рэч надзвычай каштоўную — адмысловы альбом **«Звязда» — 90: погляд у гісторыю»**, дзе рупліва сабраныя выразкі, цікавыя запісы і дакументы. З пяшчотай і замілаваннем збіралі гэты скарб нашы адданыя чытачы, і мы абяцаем гэтаксама яго захоўваць.

Ад аб'яднання «Усходнія рабочыя» Вілейскага раёна віншаванні з юбілеем агучылі старшыня — **Алена Сямёнаўна НАРКЕВІЧ**, і вельмі ініцыятыўны ўдзельнік, наш даўні чытач — **Якаў Яўгенавіч ДРЭЕР**.

— «Звяздою» захапляўся яшчэ мой бацька, таму і я чытаю газету з маленства. У сталасці цікавіўся пераважна сельскагаспадарчай тэматыкай, бо працаваў аграномам. Не прапускаю ніводнага артыкула пра вайну — мне гэта вельмі блізка як чалавеку, які ў вайну пацярпеў. Карысна пачытаць пра здароўе, развіццё аграэкатурызму ў Беларусі.

На думку Якава Яўгенавіча, у нашай газеце можна знайсці інфармацыю сабе па густу ў любым узросце і на ўсе выпадкі жыцця.

— Няма такой энцыклапедыі, якая патрэбна кожны дзень, а вось без любімай «Звязды» не абыдзешся і дня.

Ларыса ЯКАВЮК, вядучы спецыяліст па працы з грамадскасцю ў філіяле дзіцячага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Надзея» пакуль не настолькі «прафесійны» чытач, як Якаў Яўгенавіч, але мяркуе, што з цягам часу ім стане. Ларыса Барысаўна пажадала «Звяздзе» цікавасці, актуальнасці, шчырасці, а галоўнае — і ў далейшым заставацца добрай газетай для беларусаў. Ларыса Якавюк аддае перавагу артыкулам культурнай тэматыкі, цікавіцца матэрыяламі, у якіх вучаць правільна выкарыстоўваць беларускія словы. Супрацоўніца цэнтра асабліва адзначыла матэрыялы, прысвечаныя тэме здароўя:

— Прамыя лініі з дактарамі даюць чытачам «Звязды» ўнікальную магчымасць напрамую кансультавацца ў высокакваліфікаваных спецыялістаў, прычым абсалютна бясплатна. Далёка не ва ўсіх ёсць такая магчымасць у паўсядзённым жыцці.

Задаволена Ларыса Барысаўна і супрацоўніцтвам з карэспандэнтамі «Звязды»:

— Звяздоўцы — людзі дасведчаныя, цікавыя, з імі проста прыемна працаваць.

Нашы госці цэняць «Звязду» за яе скіраванасць на чытача, за рэальныя веды, якія дае газета. А мы ў сваю чаргу цэнім такіх адданых чытачоў, якія натхняюць нас на працу, бо ўсё, што піша «Звязда», — пра людзей і для іх.

Ала МАЧАЛАВА.

Інфарм-укол

ВЫКЛЮЧНЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ КАРЫЦЫ

Шведскія вучоныя ўстанавілі, што карыца валодае шэрагам лячэбных уласцівасцяў, у прыватнасці яна дазваляе рэгуляваць і зніжаць узровень цукру ў крыві, а таксама паляпшаць працэсы стрававання.

Такія вынікі навуковага эксперыменту, у якім узялі ўдзел 14 здаровых добраахвотнікаў. У іх вымяралі колькасць глюкозы ў арганізме да прыёму ежы і кожныя дзве гадзіны пасля ўжывання дэсерту з карыцай. У выніку спецыялісты ўстанавілі, што вострая прыправа здольная замаруджваць і якасна паляпшаць працэсы стрававання. Акрамя гэтага, даследаванні таксама выявілі падобныя вынікі і ў пацыентаў, якія пакутуюць ад дыябету падчас і пасля 40-дзённай дыеты, якая прадугледжвала ўжыванне карыцы.

Скарыць хлеба пасыпаная карыцай, зніжае ўзровень халестэрыну і разрэджвае кроў. А яшчэ гэта выдатная крыніца марганцу, жалеза і кальцыю. Для тых, хто пакутуе ад артрыту, усяго палова чайнай лыжкі карыцы з мёдам штодзень да яды аблегчыць іх болі ўжо праз тыдзень.

Спартсмены — дзецям

Дзе рэкорд дабрыні — там сумленне на п'едэстале

Гэтыя словы — вытрымка з гімна дабрачыннай акцыі «Спартсмены — дзецям». Першымі ў мінулую суботу яго пачулі жыхары Калінкавічаў і ўдзельнікі 21-га па ліку дабрачыннага мерапрыемства . Словы гімна міласэрнасці і дабрыні напісаў голас мінскага стадыёна «Дынама» Леанід Бандаровіч, а музыку — работнік Калінкавіцкага Дома культуры Дзмітрый Ціхіна.

— Менш за месяц таму на гэтым жа стадыёне быў майстар-клас алімпійскай чэмпіёнкі Афін Юліі Несцярэнка, — нагадаў у час адкрыцця акцыі ў Калінкавічах Іван Семяняня, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, — а сёння ў вашым горадзе сабраўся цэлы дэсант знакамітых спартсменаў (чэмпіён Еўропы і свету, сярэбраны прызёр Алімпіяды па лёгкай атлетыцы Ігар Лапшын, алімпійскі чэмпіён і чэмпіён свету па біятлону Сяргей Булыгін і г. д.).

У Калінкавічах адбыўся дэбют у дабрачыннай справе чэмпіёна свету па грэка-рымскай барацьбе Аліма Сялімава і бразільскага легіянера сталічнага ФК «Дынама» Марсіо, а некаторыя спартсмены — ужо не навічкі: чэмпіёнка Еўропы і Кубка свету па лёгкай атлетыцы Алеся Турава прыехала на дабрачынную акцыю ў другі раз, алімпійскі чэмпіён па дзюдо Ігар Макараў — у трэці, але ўпершыню ўзяў з сабой дачку і жонку, пераможца Лігі чэмпіёнаў па гандболу, ігрок іспанскага клуба «Сьюдад-Рэаль» Сяргей Рутэнка — у чацвёрты. Чэмпіёнка Беларусі па шахматах Ганна Шарэвіч, каб не адкладваць добрую справу на кастрычнік, калі акцыя пройдзе ў яе роднай Брэсцкай вобласці ў Баранавічах, зноў села на цягнік і прыехала спачатку ў Мінск, а потым на машыне ў Калінкавічы, хоць толькі вярнулася са сталіцы з міжнароднага турніру.

Падарункі і грошы ад спонсараў (імі сталі звыш 20 спартсменаў, беларускія федэрацыі хакея з шайбай і футболу, ФК МТЗ-РІПА і «Гомель», ХК «Юнацтва-Мінск» і «Гомель», прадстаўніцтва НАК па Гомельскай вобласці, Гомельскае абласное аддзяленне Фонду міру і г. д.) уручылі мясцовым Цэнтру карэкцыйнага развіцця, дзіцячаму прытулку, дзвюм ДЗЮСШ і Азарыцкай дапаможнай школе. Сярод тых, хто атрымаў прэзенты, была і жыхарка Вялікіх Аўцюкоў Галіна Шамянок, маці сямі дзяцей, уладальніца ордэна Маці: «Мы з дзецьмі вельмі рады пабачыць вядомых спартсменаў, бо ўсёй сям'ёй глядзім розныя спаборніцтвы і хварэем за беларусаў».

— Каштоўнасць гэтага мерапрыемства, — заўважыў Пётр Кірычэнка, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама, — не ў колькасці прызоў, а ва ўвазе да людзей: узровень цывілізацыі любога грамадства заключаецца менавіта ў адносінах да старых, інвалідаў і дзяцей. Я ўдзячны ўсім, хто мае вялікае сэрца і робіць дабро.

Дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ад Калінкавіцкага і Кастрычніцкага раёнаў Раісу Ціханскую кранула неабыякавасць спартсменаў да лёсу дзяцей: «Не ўсе здолелі прыехаць, бо нехта быў на зборах, але ўсе мне тэлефанавалі і пыталіся, як там справы, у прыватнасці футбаліст Генадзь Туміловіч пацікавіўся, ці прысутнічае Марсіо. Баскетбаліст Ягор Мешчаракоў і хакеіст Сяргей Шабанаў не змаглі прыехаць, але прыслалі замест сябе жонак — Таццяну і Святлану». Раіса Аляксандраўна таксама заўважыла, што быць добрым і рабіць дабро — не заўжды адно і тое ж, і выказала спадзяванне: «Будзе цудоўна, калі неабыякавымі да лёсу іншых людзей стане як мага больш чалавек і не толькі спартсмены».

Прысутныя на Калінкавіцкім стадыёне паглядзелі канцэртную праграму: перад гледачамі выступалі гурт «Тяни-толкай», Уладзімір Ухцінскі, шоў-балет «Супер-TV», гімнастка Валерыя Курыльская прадэманстравала майстэрскае валоданне стужкай, а асілак Вячаслаў Харанека — гірамі (падымаў яе, трымаючы шклянку з пітвом на сваім ілбе) і жангляваннем мячыкамі, якому навучыўся ў «Зорным цырку» **(на фота)**.

Вялікія спартсмены — вялікія сэрцы

Да 21-й дабрачыннай акцыі «Спартсмены — дзецям» маюць дачыненне звыш 500 атлетаў, якія дапамаглі каля 10 тысячам дзяцей-сірот, шматдзетным сем'ям. Навошта чэмпіёны адгукаюцца на клічдэпутатаў аб дапамозе, самі прыязджаюць у розныя куткі Беларусі, калі ў большасці з іх — свае дзеці і сем'і, асабістыя клопаты (траўмы, зніжэнне вагі, няўдачы на спаборніцтвах). Гадаць, што ж падштурхнула нашых атлетаў быць неабыякавымі да іншых людзей і чужых праблем, не стану. Спартсмены самі адкажуць на гэтае пытанне.

Ігар ЛАПШЫН: У мяне ў самога двое дзяцей. Калі ж на акцыі я пабачыў шматдзетныя сем'і, пранікнуўся да іх вялікай павагай: хоць у спартыўнай кар'еры мне ўдавалася браць самыя высокія планкі, у жыцці мне так і не ўдалося ўзяць самую высокую вышыню — мець сем дзяцей. Я з задавальненнем адгукаюся на просьбу аб дапамозе такім сем'ям і дзецям-сіротам.

Алім СЯЛІМАЎ: Гэта правільна — рабіць дабро тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Мая рэлігія (мусульманства) сцвярджае, што чалавек, у якога ёсць магчымасць дзяліцца, павінен дапамагаць іншым. Я сам вырас без бацькі і ведаю, што гэта такое, а дзецям-сіротам прыходзіцца намнога цяжэй.

Алеся ТУРАВА: Мая сястра Рыта не змагла прыехаць, бо знаходзіцца на зборах, а я з задавальненнем згадзілася прыняць удзел у дабрачыннай акцыі. Мне гэта дазваляе падняць спартыўны дух і сустрэцца з людзьмі, дзеля якіх я і выходжу на бегавую дарожку.

Ігар МАКАРАЎ: Такія акцыі і падтрымка дзяцей, і папулярызацыя спорту, бо на мерапрыемстве прысутнічае шмат сем'яў. Магчыма, некаторыя бацькі захочуць аддаць сваіх дачок і сыноў у спорт, а ў будучым яны стануць алімпійскімі чэмпіёнамі?

Сяргей РУТЭНКА: Кожнаму чалавеку прыемна атрымаць падарунак, а дзецям — асабліва. У кожнай акцыі я знаёмлюся з людзьмі са складаным лёсам і разумею, наколькі важна для іх падтрымка не толькі матэрыяльная, але і маральная. Прыемна, што дэпутаты клапоцяцца аб сваім народзе. Калі я гуляў у Славеніі, а зараз у Іспаніі, наогул не чуў аб такіх акцыях.

Ганна ШАРЭВІЧ: Я ўжо ўдзельнічала ў акцыі ў Любані, а зараз з задавальненнем прыехала ў Калінкавічы і буду падтрымліваць гэты дабрачынны рух надалей, бо трэба дапамагаць дзецям, каб яны разумелі, што ў свеце ёсць шчырыя добрыя людзі.

Асабіста мне здаецца, што дачыненне да такіх акцый дапамагае і самім удзельнікам — больш шанаваць сваіх родных і ўсё, што яны робяць для нас, а таксама разумець: у свеце мы не адзінокія ў сваіх турботах. Акрамя таго ўласныя цяжкасці, якія здаюцца неверагоднымі па маштабу, з лёгкасцю пераадольваюцца пасля знаёмства з клопатамі іншых людзей.

Ірына ПРЫМАК.
Фота Таццяны ДАНІЛУШКІНАЙ.
Калінкавічы.

КАЛІ ЧАЛАВЕК ДАВЯРАЕ ЎЛАДЗЕ

Мікалаеўскі сельскі Савет робіць многае, каб насельніцтва бачыла, што ўлада сапраўды існуе для народа, працуе для народа і непадзельная ад яго. Гэтыя словы былі сказаны старшынёй сельскага Савета Вячаславам Дзікуном на нарадзе па пытаннях выканання Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату» і ўдасканальванні ідэалагічнай работы на сучасным этапе. Нарада праходзіла ў Светлагорскім раёне. У ёй удзельнічалі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Генадзь Нявыглас, старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта краіны Алег Праляскоўскі, іншыя адказныя асобы, кіраўнікі структурных падраздзяленняў Гомельскага аблвыканкама, старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, рэктары вышэйшых навучальных устаноў, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі.

Што ж выклікала цікавасць ва ўдзельнікаў нарады ў тым сельсавеце? Сельвыканкам укараніў у практыку прынцып «адно акно» па 21 адміністрацыйнай працэдуры. Па панядзелках і пятніцах тут да 18 гадзін прадоўжаны рабочы дзень, з улікам прапаноў грамадзян арганізаваны іх прыём у суботнія дні, а таксама выязныя прыёмы ў населеных пунктах. На выпадак адсутнасці асноўнага работніка сельскага Савета, які ажыццяўляе адміністрацыйныя працэдуры для насельніцтва, падабраны і навучаны гэтай справе іншыя кадры.

Аформлена наглядная агітацыя аб рабоце па прынцыпу «адно акно», наладжана ўзаемасувязь з раённымі службамі і ўстановамі, якія абслугоўваюць людзей. Таму ў сельвыканкаме чалавеку гатовы даць тую ці іншую інфармацыю па рабоце райвыканкама, упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, натарыяльнай канторы, бюро па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру, ЗАГСа, ляс-гаса, падатковай інспекцыі і г.д. Такім чынам, атрымліваецца, што варта звярнуцца чалавеку ў сельвыканкам адзін раз, і яму дадуць неабходную даведку. А гэта — эканомія яго часу, здароўя, фінансавых затрат, большая аддача на вытворчасці. Аднымі з фактараў работы з насельніцтвам у ідэалагічным плане, у вырашэнні праблемных пытанняў з'яўляюцца сельскія сходы грамадзян па месцы жыхарства, выезды інфармацыйных груп у працоўныя калектывы і ў населеныя пункты. Пытанні, якія ўзнімаюць людзі, уключаюцца ў план работы, выкананне іх кантралюецца, а вынікі становяцца вядомымі народу праз дэпутатаў, актыў Савета, пры сустрэчах з людзьмі, інфармацыйныя стэнды ў населеных пунктах.

І як прыклад сказанаму — просьбы людзей закупляць у іх малако. Мікалаеўскі сельсавет — адзіны ў раёне, які робіць гэта. Прычым ён так наладзіў справу, што чалавеку нікуды не трэба хадзіць за грашыма, бо іх яму прыносіць паштальён. Летась было закуплена ў людзей 604 тоны малака, а за сёлетняе паўгоддзе — 287 тон.

— Наогул, — сказаў на пленарным пасяджэнні кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, — пачуццё разумення паміж чыноўнікамі і чалавекам на Гомельшчыне ёсць, і перш за ўсё за кошт таго, што актыўна вывучаецца меркаванне людзей, іхнія пажаданні.

Да такой высновы ён прыйшоў, азнаёміўшыся са станам спраў таксама ў калектывах творчага ўніятарнага прадпрыемства «Ранак», дзе даў інтэрв'ю ў прамым эфіры, філіяла № 322 ААБ «Беларусбанк», стадыёна «Папернік» адкрытага акцыянернага таварыства «Светлагорскі цэлюлозна-папяровы камбінат». Толькі гар(рай)выканкамы прынялі сёлета 4365 чалавек па іх просьбах. А «прамыя» і «гарачыя» лініі, што праводзяць і кіраўнікі аблвыканкама і абласнога Савета дэпутатаў, першыя асобы розных службаў вобласці? А работа інфармацыйна-прапагандысцкіх груп? Толькі абласных налічваецца 6, тэрытарыяльных — 480 і галіновых — 1658. Чым, як кажуць, не сіла, якая дае адказы на ўсе пытанні і праблемы, што хвалююць людзей?

Гэтая і іншая работа з насельніцтвам, адзначыў Генадзь Мікалаевіч, сведчыць аб высокім узроўні арганізацыі інфармаванасці насельніцтва, і ў гэтым плане Гомельшчына выгадна адрозніваецца ад Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей, дзе праходзілі адпаведныя нарады. І нездарма была названа наступная лічба — 1051. На такую колькасць скараціліся зваротыў людзей у аблвыканкам і на 44 працэнты — у Адміністрацыю Прэзідэнта ў параўнанні з першым паўгоддзем 2006 года.

Але калі пры апытаннях жыхары вобласці ўказвалі на паляпшэнне гандлёвага, транспартнага абслугоўвання, паляпшэнне работы ўстаноў адукацыі, дык гэтага не скажаш аб рабоце медыкаў. І яшчэ. Кожны чацвёрты апытаны ўказаў на фармалізм асобных чыноўнікаў, што, безумоўна, выклікае роздум.

А куды гэта варта, што асобныя кіраўнікі дапускаюць парушэнні заканадаўства, не прыслухоўваюцца (і, больш за тое), ігнаруюць думку людзей? Вось яскравыя прыклады гэтага. Аператар машыннага даення кароў з Чырвонага Берага, што ў Жлобінскім раёне, тры гады звярталася ў райвыканкам са скаргай на дрэнныя жыллёвыя ўмовы. І ўсё — безвынікова. Тады справай яе шматдзетнай сям'і заняўся аблвыканкам, і ўсё вырашылася. Або яшчэ. У КСУП імя Валадарскага Кармянскага раёна з пасады раённыя ўлады знялі кіраўніка гаспадаркі. Без згоды людзей, якія ўсталі за яго гарой. Скарга ад калектыву паляцела да Прэзідэнта краіны, і справядлівасць была адноўленая.

Пры добрай у цэлым ідэалагічнай рабоце адзіных дзён інфармаванасці насельніцтва слаба задзейнічаны дырэктарскі корпус. Асаблівая ўвага патрабуецца ў рабоце з моладдзю, дзе назіраецца беспрацоўе, на нізкім узроўні праводзяцца розныя выхаваўчыя мерапрыемствы. Адным словам, рэзерваў у выкананні Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату» і ўдасканальванні ідэалагічнай работы на сучасным этапе на Гомельшчыне, як, дарэчы, і ў іншых абласцях краіны, яшчэ хапае.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.
Светлагорскі раён.

Эстафета здароўя — для супрацоўнікаў міліцыі

У выхадныя ўпершыню адбылася спартыўная эстафета здароўя «Тата, мама, я — спартыўная сям'я», у якой узялі ўдзел сем'і супрацоўнікаў мінскай міліцыі. Ініцыятарам гэтага спаборніцтва выступіла ўпраўленне кадраў УУС Мінгарвыканкама.

У эстафеце ўдзельнічалі сем'і з кожнага падраздзялення сталічнай міліцыі. Трапнасць стральбы з пнеўматычнай вінтоўкі дэманстравалі таты, мамы кідалі дроцікі, а самыя юныя ўдзельнікі спаборнічалі ў пераходзе на «дошках». Усе разам яны прайшлі вялікую трасу, на якой сустракаліся розныя перашкоды.

— Для нас вельмі важна здароўе кожнага супрацоўніка, — зазначыў «галоўны тата»спартыўнай эстафеты, начальнік УУС Мінгарвыканкама генерал-маёр Анатоль Куляшоў, — бо менавіта гэта ўплывае на добрасумленнае нясенне службы.

Правядзенне спартыўнай эстафеты здароўя стане традыцыяй. Супрацоўнікі міліцыі змогуць паспрачацца за званне самай спартыўнай сям'і ўжо гэтай зімой.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

А НА ДЭСЕРТ — КАРЦІНА З БАНАНАЎ

Прэзентацыя міжнароднага мастацкага праекта «Сеанс» адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Удзел у ім прынялі жывапісцы Беларусі, Расіі, Сербіі, Нарвегіі, Украіны. Пазнаёміцца з творчай кухняй мастакоў усе жадаючыя маглі на цырымоніі адкрыцця экспазіцыі. На вачах у гледачоў карціны стваралі сталічныя майстры пэндзля Віктар Ціханаў, Юрый Падолін, Фёдар Ястраб. Прычым апошні выбраў для гэтага не фарбы, а бананы, вінаград, зялёную цыбулю, пятрушку.

Ала КАЗАКОВА, «Мінск-Навіны».

Сталічны госць

Экстрым на «Трактары»

Паставіць машыну заднім ходам у гараж і язда «змейкай» — банальная рэч у параўнанні з тым, што робіць француз Патрык Барні. Сусветны майстра трукаў упершыню выступіў у Беларусі на сталічным стадыёне «Трактар». На яго «Аўтамоташоў» у нядзелю сабраліся, пэўна, усе мясцовыя аматары экстрэмальнага ваджэння і аўтамабіляў.

У час выступлення сталічных гасцей мужчыны і нават жанчыны абмяркоўвалі, як жа Барні ўдаецца весці грузавік на задніх колах асабліва на невялікай хуткасці і разварочвацца ў такім стане на 180 градусаў. Дарэчы, менавіта Патрык стаў першым у свеце, хто змог утрымліваць грузавік на задніх колах. Гледачы сталі сведкамі акрабатыкі на цяжкіх матацыклах на зямлі і ў паветры (напрыклад, скачкоў з трамплiна), шэрагу трукаў на аўтамабілях BMW, якія рухаліся ў бакавым становішчы на двух колах і г. д. Французскія экстрэмалы дэманстравалі і індывідуальнае майстэрства кіравання машынамі і працавалі сінхронна ў пары. Дарэчы, у шоў удзельнічаў і сын Патрыка Барні Кірыл.

— Я таксама, як і сын, пачынаў з трукаў на матацыкле, — сказаў Патрык Барні. — Зараз маёй справе спаўняецца 30 гадоў. Француз таксама прызнаўся, што ў Мінску яго ўразілі чыстае паветра, малы рух і прыгожыя жанчыны.

Ірына ПРЫМАК.
Фота Вольгі КЛЯШЧУК.

Гомель памятае Героя Расіі

Гэтымі днямі споўніцца пятнаццаць гадоў, як падпалкоўнік расійскіх ваенна-паветраных сіл Віктар Оськін у небе над Гомелем здзейсніў подзвіг, за які яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Расіі. Дарэчы, першаму ў гісторыі дальняй авіяцыі Расійскай Федэрацыі.

Быў дзень 24 ліпеня 1992 года, і Віктар Оськін, намеснік камандзіра авіяпалка, што размяшчаўся ў Зябраўцы, ажыццяўляў палёт у якасці інструктара над Гомелем на звышгукавым самалёце Ту-22у. На ўзлёце на вышыні 900 метраў раптам загарэўся левы рукавік, а праз некалькі секунд і правы. Унізе — жылыя кварталы Навабеліцкага раёна горада, і пілот, і камандзір авіяэскадрыллі Аляксандр Сцепчанкоў і штурман Мікалай Іваноў добра разумеюць, што можа адбыцца, калі магутная машына вагой у 65 тон з 18 тонамі паліва ўпадзе туды. Рашэнне прынята: чаго б гэта ні каштавала, адвесці самалёт ад горада, а для гэтага трэба ўтрымаць яго як мага даўжэй у паветры.

Неверагоднымі намаганнямі, дзякуючы высокаму майстэрству, набытаму ў час вучэбных налётаў на працягу 1200 гадзін, 40-гадоваму пілоту ўдаецца гэта зрабіць, рызыкуючы жыццём. Ён паступова зніжае вышыню і дае каманду катапультавацца штурману і камандзіру авіяэскадрыллі. Апошнія пакінулі самалёт на вышыні адпаведна 450 і 400 метраў, а Віктар Оськін зрабіў гэта, калі ўпэўніўся, што самалёт не прынясе бяды гораду... Яму не хапіла для выратавання ўсяго трыццаці метраў.

Герой Расіі пахаваны на могілках пад Гомелем. Рашэннем гарвыканкама яму прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Гомеля». Яго імя носіць адна з вуліц Навабеліцкага раёна, адкрыты экспазіцыі аб яго гераічным подзвігу ў абласным музеі ваеннай славы і дзвюх школах горада. Каля магілы Віктара Оськіна заўсёды кветкі ад гамяльчан, якія яго ніколі не забудуць.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ НА 8-М ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже объектов республиканской собственности 15 августа 2007 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	АТМЗ-5-4320 з.н. 2773, ш. 058775, дв. 934939	п/о Линово р-н Оранчицы в/ч 67675Ф	1986	38694	49 000 000	4 900 000
2.	АТМЗ-5-4320 з.н. 1287, ш. 025314, дв. 585752	п/о Линово р-н Оранчицы в/ч 67675Ф	1984	21725	38 500 000	3 850 000

8-й аукцион состоится в 11.00 15 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 13 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 15 августа 2007 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.** Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

По ранее проведенным торгам извещение публиковалось в газете «Звязда» 7 июня 2007 г.

Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com e-mail: info@belspeckontrakt.com

Валерый ДЗЕМІДЗЕНКА:
«ДЭВІЗ НАШАГА ПРАДПРЫЕМСТВА — ПАСТАЯННЫЯ КЛОПАТЫ АБ ПАШЫРЭННІ АСАРТЫМЕНТУ ПРАДУКЦЫІ І ПАВЫШЭННІ ЯЕ ЯКАСЦІ»

Прадстаўляем суразмоўцу

Родам з Хойніцкага раёна. Пасля заканчэння школы паступіў у Рэчыцкі ветэрынарны тэхнікум. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Віцебскай ветэрынарнай акадэміі і Гомельскім кааператыўным інстытуце. Працоўная біяграфія Валерыя Дземідзенкі пачалася ў Гомельскай абласной ветэрынарнай лабараторыі, затым, праз некалькі гадоў, ён узначаліў завод ветэрынарных прэпаратаў, а ў 1989-м яго прызначылі на новую пасаду — кіраўніка Гомельскага мясакамбіната, якую ён займае і зараз. Наогул, дырэктарскі стаж у Валерыя Аляксандравіча — дваццаць сем гадоў. На сёння гэта самы вялікі стаж сярод кіраўнікоў усіх прадпрыемстваў Гомеля. Аб яго вялікім практычным вопыце, высокім прафесійным майстэрстве, добрых арганізатарскіх здольнасцях і аўтарытэце сведчыць хоць бы той факт, што ён абраны старшынёй Савета дырэктарскага корпуса горада.

— Валерый Аляксандравіч, на фасадзе будынка вашага прадпрыемства вялікімі літарамі напісана «Векавыя традыцыі — гарантыя якасці». Які сэнс укладвае ваш калектыў у гэты лозунг ці дэвіз?

— Зазірнём у гісторыю. Пачну з таго, што Гомельскі мясакамбінат быў заснаваны ў 1896 годзе. То была прыватная бойня, дзе перапрацоўка жывёлы ажыццяўлялася прымітыўна, уручную. Але, як кажуць, час не стаіць на месцы, ён рухаецца наперад і прымушае да гэтага ўсіх і ўсё. Таму невыпадковая з'ява: паступовае пераабсталяванне бойні, якое прывяло да таго, што ў 1930 годзе была праведзена значная рэканструкцыя прадпрыемства. Ужо тады і пазней прымаліся адпаведныя захады для пашырэння асартыменту прадукцыі і павышэння яе якасці, што і стала дэвізам калектыву, якія змянялі адзін аднаго.

У гады Вялікай Айчыннай вайны камбінат быў амаль цалкам зруйнаваны, і таму давялося прыкласці шмат намаганняў для аднаўлення яго работы. Паступова пашыралася вытворчасць, набывалася больш дасканаласта тэхніка, паляпшалася тэхналогія. Зараз камбінат, які з'яўляецца адкрытым акцыянерным таварыствам, па праву лічыцца буйным высокавытворчым і канкурэнтаздольным прадпрыемствам. І мы з гонарам кажам: за час 111-гадовага існавання камбінат пацвярджае сваю высокую марку. У наш век новых тэндэнцый, напрамкаў і развіцця новых рынкавых умоў мы захавалі накоплены за доўгія гады вопыт па вырабу прадукцыі, якая здольна задаволіць самы далікатны густ.

— Аб гэтым, калі ласка, больш падрабязна.

— ААТ «Гомельскі мясакамбінат» — прадпрыемства па перапрацоўцы мяса, вытворчасці каўбасных вырабаў і паўфабрыкатаў. На сёння мы вырабляем і рэалізуем каля двухсот відаў розных прадуктаў, разлічаных на кожнага спажыўца, і камбінат займае больш як 50 працэнтаў спажывецкага рынку мяса і мясных вырабаў у нашым горадзе.

Прадпрыемства пастаўляе прадукцыю і на экспарт. Нашымі буйнейшымі партнёрамі ў гэтай сферы з'яўляюцца фірмы Расіі і Італіі. Мы маем намер пашырыць за мяжу асартымент пастаўляемых тавараў, у выпуску якіх удала спалучаюцца старажытныя і сучасныя тэхналогіі. Камбінат кожны год прымае ўдзел у розных выставах, форумах, конкурсах, у тым ліку і міжнародных, і наша прадукцыя неаднаразова атрымлівала дыпломы, становячыся пераможцамі і лаўрэатамі. З апошніх пераканаўчых узнагарод — гэта прэмія ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці ў 2006 годзе.

— Як вядома, Валерый Аляксандравіч, у сёлетнім маі спецыялісты Расійскага сельгаснагляду правялі інспекцыйныя праверкі прадпрыемстваў, падобных на ваша, Гомельскай і Магілёўскай абласцей...

— Пытанне далей можаце не працягваць, бо я зразумеў вас і скажу, што расійская федэральная служба па ветэрынарнаму і фітасанітарнаму нагляду ўключыла наш камбінат у ліпені ў спіс атэставаных пастаўшчыкоў прадукцыі ў Расію, на што ў нас маюцца афіцыйныя пацвярджэнні. Іншымі словамі, нашаму калектыву за сваю прадукцыю не сорамна. Яна адпавядае ўсім патрабаванням у плане яе бяспекі, як гэта і прадугледжана міжнароднай сістэмай HACCP.

— Ці можна выказаць меркаванне, што інспекцыйная праверка расійскіх прафесіяналаў была для вас своеасаблівым экзаменам, да якога трэба было рыхтавацца? Магчыма, сумненні нейкія вас адольвалі наконт здачы таго экзамену?

— Сумненняў ніякіх у нас не было, што мы пацвердзім свой высокі клас. Лёгкія хваляванні — былі. Мы ведалі слабыя бакі сваёй вытворчасці і пастараліся іх ухіліць арганізавана. Не буду тут многа гаварыць аб рабоце калектыву ў напрамку паляпшэння якасці прадукцыі, але асноўныя моманты лічу неабходным назваць.

Мэты і задачы прадпрыемства ў галіне якасці распрацаваны кіраўніцтвам камбіната на аснове вывучэння попыту пакупнікоў і іхняй думкі аб ёй. І палітыка наша тут такая — забеспячэнне спажыўцоў толькі бяспечнымі і якаснымі прадуктамі. На прадпрыемстве ўкаранёна сістэма менеджменту якасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ИСО 9000—2001, атрыманы ў 2005 годзе сертыфікат адпаведнасці па вытворчасці каўбасных вырабаў, прадуктаў з мяса і мясных паўфабрыкатаў. Летась, як гэта прадугледжвала зацверджаная праграма, было праведзена 34 унутраныя аўдыты на адпаведнасць дзейнасці структурных падраздзяленняў у сістэме менеджменту якасці СТБ ИСО 9001—2001.

Для арганізацыі дзейнасці прадпрыемства створаны каардынацыйны Савет, які ўзначальвае дырэктар прадпрыемства. Адказным за сістэму менеджменту якасці на камбінаце з'яўляецца галоўны інжынер. Я ўжо не гавару пра тое (бо гэта і так зразумела), што для распрацоўкі прынцыпаў метадычнага кіраўніцтва дзейнасцю структурных падраздзяленняў па ўдасканальванню, забеспячэнню эфектыўнага функцыянавання сістэмы менеджменту якасці на прадпрыемстве, пастаяннага яе маніторынгу створаны аддзел па кіраванню якасці, і ён добра спраўляецца з ускладзенымі на яго задачамі. Кантроль за бяспекай прадукцыі ажыццяўляецца вытворча-тэхналагічнай і радыеметрычнай лабараторыямі, якія акрэдытаваны ў сістэме акрэдытацыі Рэспублікі Беларусь.

— У вышэйпамянёных пытаннях павышэння якасці прадукцыі, Валерый Аляксандравіч, відаць, нельга не закрануць і рэканструкцыю прадпрыемства, пастаяннае ўдасканальванне тэхнікі і тэхналогій, навукова-тэхнічны прагрэс. Ці не так?

— Так. Без гэтага немагчыма не толькі паляпшаць якасць нашых тавараў і ўмовы працы людзей, але і павялічыць аб'ёмы вытворчасці. Таму значную частку фінансавых сродкаў мы накіроўваем на закуп новага тэхналагічнага абсталявання, якое адпавядае сусветным стандартам. Напрыклад, у 2003 годзе інвестыцыі ў асноўны капітал склалі 2698 мільёнаў рублёў, пяцьдзесят працэнтаў якіх было выдзелена на набыццё лёдагенератара WL-2400, паўаўтаматычнага кліпсатара KDCV-200, шпрыца ротарнага RISKO-400, кутэра вакуумнага «Тайфун» і інш.

У 2004 годзе інвестыцыі на пакупку тэхналагічнага абсталявання склалі ўжо 1186 мільёнаў рублёў, у 2005-м — 1798 мільёнаў. А ў мінулым — яшчэ больш. У выніку толькі летась у эксплуатацыю ўведзена 59 адзінак абсталявання, у тым ліку 20 — асноўнага тэхналагічнага. А наогул на паляпшэнне якасці прадукцыі і развіццё вытворчасці кожны год мы выдаткоўваем да аднаго мільёна долараў.

У нас поўнасцю завершана тэхнічнае пераўзбраенне каўбаснай вытворчасці, і на сёння тут няма ніводнай адзінкі афарбаванага абсталявання, а ёсць толькі нержавеючае. Характэрная дэталь: у нас з'явіліся такія прафесіі, як электроншчык. І гэта сведчыць аб тым, што ў корані мяняецца якасны склад кадраў, бо на асобных вытворчых участках удзел чалавека ў працэсе, калі можна так выказацца, зведзены да мінімуму, калі не да нуля. Бо працуе тэхніка, камп'ютар, электроніка, і калі, напрыклад, адкрыем тэрмакамеру, то камп'ютар спытае ў цябе, а навошта рабіў гэта? Вось і атрымліваецца наступнае: калі раней галоўнай прыладай працы на прадпрыемстве быў нож, дык зараз электроннае забеспячэнне патрабуе кваліфікацыі спецыялістаў на базе вышэйшай адукацыі.

— У сувязі з гэтым, відаць, на парадак дня паўстаюць пытанні падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў?

— А як жа. І тут я хачу сказаць, што тэхналагаў нам рыхтуюць у Магілёўскім тэхналагічным інстытуце. На жаль, асноўная ж падрыхтоўка іх сапраўднай работы ідзе непасрэдна на вытворчасці, гэта значыць, у нас. А інакш, аказваецца, і быць не можа, бо не ў крыўду будзе сказана, што на працягу пяці гадоў вучобы будучы спецыяліст бачыць гэту вытворчасць толькі два—тры месяцы. Бо праграма навучання ў ВНУ так складзена, а трэба практычнаму працэсу ў ёй надаць больш увагі.

— Напэўна, Валерый Аляксандравіч, на ваш камбінат цяжка ўладкавацца на працу?

— Цяжка. Мы не можам даць работу адразу нават усім выпускнікам інстытута па іх профілю і адпраўляем іх на рабочыя месцы.

Такая смаката — пальчыкі абліжаш!

ААТ «ГОМЕЛЬСКІ МЯСАКАМБІНАТ»
246021, г. Гомель, вул. Ільіча, 2
E-mail: gmk1@server.by
Тэл. +375 232 36-26-49
Факс: +375 232 37-48-50.

Гэта зусім не азначае, што ў іх няма перспектывы росту. Не, яна ёсць. І калі хто закончыў інстытут, скажам, сёлета, дык налета ён атрымае пасаду, якая адпавядае яго кваліфікацыі. Толькі старайся. Але маюцца ў нас і людзі з вышэйшай адукацыяй, напрыклад, фізкультурнай і г.д., якія працуюць абвальшчыкамі мяса і да таго падобнага і, атрымліваючы 700 тысяч рублёў у месяц, на іншую работу не прэтэндуюць.

— А што вы можаце сказаць аб умовах працы вашага калектыву, яго культурным жыцці, аб спартыўных дасягненнях.

— На камбінаце звыш 1300 чалавек. Ва ўсіх вытворчых падраздзяленнях для работнікаў створаны добрыя ўмовы працы, у іх ёсць магчымасць павышаць сваю кваліфікацыю на спецыяльных курсах, удасканальвацца ў тым ліку і ў замежных партнёраў. Не буду ўтойваць, на асобных працэсах ёсць яшчэ і ручная праца, якая будзе ўжо ў наступным годзе механізавана.

У санітарна-бытавым корпусе маюцца душавыя пакоі, рабочыя забяспечваюцца спецадзеннем. Ёсць у нас медпункт, сталовая, дзе харчаванне недарагое, працуе стол заказаў. Вялікая ўвага надаецца культурнаму адпачынку, фізкультурнай і спартыўнай рабоце, масавацкай самадзейнасці. Клапоцімся мы і аб ветэранах працы, якія ўжо на пенсіі. Такіх у нас 650 чалавек. І кожнаму з іх мы аказваем адпаведную дапамогу.

— А якія ў вас узаемаадносіны з партнёрамі, пастаўшчыкамі сыравіны, абсталявання, гандлёвымі арганізацыямі?

— Нармальныя. Колькасць іх, у тым ліку і замежных, дасягае тысячы. З многімі мы працуем ужо не адзін год і асабліва цэнім доўгатэрміновае супрацоўніцтва і ўзаемны давер, выкананне абавязацельстваў адзін перад адным.

— І няўжо нішто не азмрочвае вось такі настрой?

— Пастаўшчыкамі жывёлы на камбінат з'яўляюцца сельскагаспадарчыя прадпрыемствы вобласці і рэспублікі, і сёлета імпартазамяняльнай сыравіны ў нас няма. Разлікі з імі (а дарэчы, каля палавіны калгасаў і саўгасаў з'яўляюцца нашымі акцыянерамі) мы робім своечасова. Па гандлю — іншая размова. У яго свае цяжкасці — адсутнасць абаротных сродкаў. На жаль, перапрацоўчыя прадпрыемствы сёння крэдытуюць гандлёвыя арганізацыі. І мы павінны гэта разумець. Ёсць моманты неплацяжоў за пастаўленую прадукцыю і нашаму камбінату. Так, пратэрмінаваная запазычанасць складае на сёння 436 мільёнаў рублёў. Паўтараю, мы разумеем сітуацыю і разглядаем яе ў цывілізаваным рэчышчы. Калі ж хто спрабуе спекуляваць на той сітуацыі, мы з імі проста не працуем.

— Што вас хвалюе яшчэ?

— Эканамічныя пытанні, якія не залежаць ад прадпрыемства, і ў прыватнасці, кошт энергарэсурсаў, падатковая нагрузка і г.д. Уявіце сабе, што камбінат даўно не з'яўляецца манапалістам у вырабе прадукцыі і яе рэалізацыі, але ён знаходзіцца ў рамках дэкларавання адпускных цэн. І што ж атрымліваецца, калі закупачныя цэны на тую ж сыравіну павялічваюцца на пятнаццаць, скажам, працэнтаў, а адпускная (на наш тавар) — на 0,6 працэнта? Мы баімся, што наша прадукцыя ў такім выпадку можа стаць неканкурэнтаздольнай.

— Іншымі словамі, Валерый Аляксандравіч, вы за тое, каб увесь ланцужок (выкажамся так), ад кошту энергарэсурсаў да кошту сыравіны адсочваўся як мае быць?

— Безумоўна.

— І якія ж перспектывы ў вашага камбіната?

— Працаваць на карысць спажыўцу, дасягаць высокіх вынікаў. Такія прадпрыемствы, як наша, запатрабаваныя. Яны не залежныя ад палітычных сітуацый. Уявіце сабе, што за сто адзінаццаць гадоў існавання камбінат не працаваў усяго дзевяць месяцаў: тры — калі тэрыторыя Беларусі была акупавана нямецкімі фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і шэсць — пасля вызвалення рэспублікі...

Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ДЫНАМІКА АСНОЎНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КАМБІНАТА ЗА 2002—2006 ГАДЫ

- *Тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці ў супастаўных цэнах склаў 212 працэнтаў.*
- *Тэмп росту спажывецкіх тавараў склаў 217,8 працэнта.*
- *Тэмп росту прадукцыйнасці працы — 203 працэнты.*
- *Аб'ём экспарту павялічыўся ў 6,2 раза.*
- *Аб'ём перапрацоўкі жывёлы павялічыўся ў 2,1 раза (з 12,1 тысячы тон да 24,9 тысячы).*
- *Тэмп росту па вытворчасці мяса і субпрадуктаў першай катэгорыі склаў 222 працэнты (з 6,6 тысячы тон да 11,3 тысячы).*
- *Тэмп росту па вытворчасці мясных паўфабрыкатаў склаў 192 працэнты (вытворчасць іх павялічылася з 1616 тон да 3841 тоны).*

НЯЎДЗЯЧНЫ ГОСЦЬ

Грамадзянін Азербайджана падазраецца ў злоўжыванні беларускай гасціннасцю.

Паводле звестак, атрыманых у Галоўным управленні ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, жыхар Баку прыехаў у нашу сталіцу ў госці да знаёмых. Пасля заканчэння візіту азербайджанец незаўважна для гаспадароў «абчысціў» іх кватэру: прыхапіў з сабою 45 мільёнаў рублёў, 2 залатыя пярсцёнкі, 2 сотавыя тэлефоны, лічбавы фотаапарат і знік. Міліцыя вядзе вышук няўдзячнага госця. За першую палову гэтага года ў Мінску зарэгістравана амаль 1,8 тысячы кватэрных крадзяжоў. Прыкладна палова такіх злачынстваў здзейснена шляхам вольнага доступу ў жыллё абрабаваных: праз адчыненыя вокны, форткі і нават дзверы, а таксама пасля сумесных застолляў са знаёмымі.

ПАСПЯШЫЛІ — ГРАНІЦУ ПАРУШЫЛІ

Жыхару Мазыра тэрмінова захацелася з'ездзіць у Адэсу на адпачынак, але ягоны пашпарт знаходзіўся на афармленні ў мясцовым аддзеле па грамадзянству і міграцыі.

Замест таго, каб адкласці паездку да мора, мазыранін пазычыў пашпарт у сябра і рушыў у бок беларуска-ўкраінскай мяжы. «Манеўр» не ўдаўся. Як паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржкамітэта пагранічных войскаў Беларусі, чалавека з чужым пашпартам затрымалі ў пункце пропуску «Аляксандраўка». Зараз нецярплівому грамадзяніну давядзецца мінімум трое сутак правесці за кратамі да поўнага высвятлення ўсіх абставінаў. А вось грамадзяніну Грузіі, наадварот, вельмі хацелася дамоў. Таму, каб хутчэй вярнуцца ў родныя пенаты, ён не стаў чакаць, пакуль супрацоўнікі грузінскай амбасады ў Маскве аформяць яму пасведчанне аб вяртанні. Адмысловы дакумент ён проста купіў у земляка, пасля чаго паветраным шляхам праз Беларусь накіраваўся ў Грузію. Але да радзімы горац так і не даляцеў. У Нацыянальным аэрапорце «Мінск-2» падробку выявілі беларускія памежнікі і затрымалі парушальніка на некалькі сутак.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 22 (554)
аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

■ Кабыла, 5 гадоў.
Тэл.: 8-017-723-36-73, 8-029-766-83-71.

■ ВАЗ-21074, 1995 г.в., 1,6Б, белы, ТА-2007 г.
Тэл.: 8-017-195-14-32, 8-029-708-64-39.

■ Самаробны трактар, рухавік бензінавы, без гідраўлікі, 950 у.а.
Тэл. 8-017-703-53-63 (пасля 15 гадзін).

■ Плугі, акучнік, бароны сеткавыя, касілка, культыватар, рухавік Д-243.
Тэл. 8-029-772-73-37.

■ Прычэп «Зубраня», касілка, прычэп да міні-трактара, сепаратар для малака.
Тэл. 8-017-507-72-72.

■ Мабільны тэлефон «Nokia 6030», амаль новы, каляровы экран, поліфанія, радыё, гарантыя, 110 у.а.
Тэл. 8-017-276-18-74.

■ Трактар МТЗ-50, Т-40АМ у добрым стане, бульбакапалка да МТЗ.
Тэл. 8-017-184-24-58.

■ Камбайн КС-5 з дакументамі.
Тэл.: 8-029-892-57-04, 8-029-590-76-64.

■ «Аудзі-80», 89 г.в., металік, аўтапрычэп, трактар МТЗ-80.
Тэл. 8-029-772-73-37.

■ Кінакамеры «Кварц-2-8С3», «Кіеў 1,6УЭ», «Краснагорск», «Украіна-5». Фотаапараты «Фотакор», «Масква-4,5», «Кіеў-6С», «Кіеў-вега» і інш. Шмат розных аб'ектываў і прыладаў, фотапавелічальнікаў.
Тэл.: 8-0151-33-31-10, 8-0292-66-04-65.

■ Кабан жывой вагой. Дзяржынскі раён, в. Скірмантава. Цана дагаворная.
Тэл. 8-029-147-34-23.

Куплю

■ Дом.
Тэл. 8-029-778-33-38.

■ Памяшканне пад вытворчасць, склад, офіс, магазін.
Тэл. 8-029-682-14-42.

■ Бульбакапалку.
Тэл. 8-0171-84-21-61.

■ Кабіну МТЗ-80-УК, КПП, задні мост.
Тэл. 8-029-772-73-37.

■ Трактар Т-25 з дакументамі, можна ў нерабочым стане.
Тэл. 8-029-332-63-93.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, паштоўкі і значкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8-029-850-17-29.

Рознае

■ Маладыя людзі (не студэнты) без шкодных звычак здымуць 1-пакаёвую кватэру ў Мінску на працяглы тэрмін. Чысціня, дыскцыпліна, своечасовая аплата!
Тэл.: 8-029-509-08-09 (Андрэй), 8-029-505-98-10 (Павел).

■ Брыгада выканае ўсе будаўнічыя работы хутка і якасна. Матэрыял заказчыка.
Тэл. 8-029-761-87-25 (увечары).

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

Дзве даты

24 ліпеня

1945 год — прэзідэнт ЗША Г. Трумэн на Патсдамскай канферэнцыі аб'явіў аб стварэнні ядзернай зброі, аддаўшы адначасова загад аб баявым прымяненні бомбы супраць Японіі. Як вядома, у 1945 годзе ЗША былі адзінай ядзернай дзяржавай у свеце. Стратэгічная перавага прывяла да таго, што амерыканскія ваенныя сталі ладзіць планы прэвентыўнага ўдару па СССР. Але амерыканская манаполія на ядзерную зброю захоўвалася толькі 4 гады.

1672 год — пачала дзейнасць Слуцкая друкарня. За перыяд з 1673 года па 1687 гады былі выдадзены 29 назваў кніг тыражом больш як 30 тысяч экзэмпляраў — друкаваліся мастацкія творы, календары, вучэбныя падручнікі, мемуары, кнігі рэлігійнага зместу, дапаможнікі па ваеннай справе, пераклады з замежных моў. Многія выданні, якія былі прыгожа аздобленыя, выкарыстоўваліся як падарункі. У канцы XVII стагоддзя княгіня Людавіка Караліна Радзівіл перадала друкарню сіноду кальвінісцкай царквы ВКЛ.

Цытата дня:

«Прыстойныя людзі набываюць больш ворагаў сваімі прамовамі, чым дурныя сваімі справамі».
Жан Поль (1768—1825), нямецкі пісьменнік.

У суд Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Дуброўкі Аляксандра Леанідавіча,** 28 красавіка 1963 года нараджэння, ураджэнца в. Патапавічы Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл., апошняе месца жыхарства якога: г. Ляхавічы, вул. Будаўнікоў, 14-6. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб А.Л. Дуброўку паведаміць іх суду Ляхавіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Камінскага Сяргея Мікалаевіча,** 14 сакавіка 1965 года нараджэння, ураджэнца в. Вялікая Лотва Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл., апошняе месца жыхарства якога: вул. Ламаносава, 17, в. Вялікая Лотва Ляхавіцкага р-на. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб С.М. Камінскага паведаміць іх суду Ляхавіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Чыгуначнага раёна г. Віцебска паступіла заява аб прызнанні памерлым **Лапатава Андрэя Мечыслававіча,** 10 красавіка 1965 года нараджэння, ураджэнца в. Вялікія Лукі, Пскоўскай вобл., РФ, апошняе месца жыхарства якога: г. Віцебск, вул. Будзёнага, 3-17. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб А.М. Лапатаве, паведаміць іх суду Чыгуначнага раёна г. Віцебска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Стэльмашонка Ігара Мікалаевіча,** 28 сакавіка 1970 года нараджэння, ураджэнца в. Баклань Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл., апошняе месца жыхарства якога: в. Брынеў Петрыкаўскага р-на. У маі 2005 г. выехаў на працу ў Маскву, пасля чаго звестак аб ім не паступала. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб І.М. Стэльмашонку, паведаміць іх суду Петрыкаўскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Лідскага раёна паступіла заява аб прызнанні памерлым **Шыкуця Аляксандра Іванавіча,** 1971 года нараджэння, ураджэнца г. Ліда, апошняе месца жыхарства якога: г. Ліда, вул. Лупава, 6-4. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб А.І. Шыкуцю паведаміць іх суду Лідскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Чыгуначнага раёна г. Віцебска паступіла заява аб прызнанні памерлым **Анікеева Уладзіміра Фёдаравіча,** 15 чэрвеня 1953 года нараджэння, ураджэнца в. В. Люшаў Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл., апошняе месца жыхарства якога: г. Віцебск, вул. К. Маркса, 44-51. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб І.Ф. Анікееве, паведаміць іх суду Чыгуначнага раёна г. Віцебска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Считать недействительными утерянные полисы добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу ЗАО «СК «АльВеНа» формы 2 РН/2РП серии АВ/МТ № 0150409—0150410, 0155815—0155819, 0155822, 0126604—0126611, 0120819—0120820, 0130097, 0139942—0139944, 0139970, 0151344.

Диплом БГАК № 056760 от 27.06.1987 г. на имя **А.С. Муха** ***считать недействительным*** в связи с утерей.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.09	21.22	16.13
Віцебск —	4.52	21.18	16.26
Магілёў —	4.59	21.12	16.13
Гомель —	5.03	21.01	15.58
Гродна —	5.26	21.36	16.10
Брэст —	5.34	21.29	15.55

Месяц

Першая квадра 22 ліпеня
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Алены, Вольгі;*
К. *Вольгі, Міхаліны, Хрысціны, Антона, Барыса, Войцеха.*

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 24.07.2007

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба: UV INDEX 63
З улікам прагназуемай воблачнасці: UV INDEX 56

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **20 хвілін**.

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+15 — +17 °C	МАСКВА	+20 — +22 °C
ВІЛЬНЮС	+19 — +21 °C	РЫГА	+19 — +21 °C
КІЕЎ	+23 — +25 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+15 — +17 °C

Усміхнёмся!

— Як называецца месца на могілках, дзе сядзіць вартаўнік?

— Жывы куток...

☺

— Тата, мне трэба табе штосьці сказаць!
— Толькі коратка і ясна!
— Сто долараў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.188. Індэкс 63850. Зак. № 3963. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12